ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 51 (1273) | Серада, 25 чэрвеня 1958 года | Цана 40 кап.

ДЗЕЛЯ ШЧАСЦЯ НАРОДНАГА

У нашай краіне няма такога дня, каб мы не адчувалі ўвагі Камуністычнай партыі, Савецкага ўрада да жыцця і патрэб працоўнага чалавека. І што не рабілася б у гэтым напрамку—ці праводзіцца рэарганізацыя кіравання прамысловасцю і будаўніцтвам або рэарганізацыя машынна-трактарных станцый, ці прымаюцца захады да павялічэння выпуску мэблі, або паляпшэння справы па выпуску абутку для дзяцей—ва ўсім відаць шчырыя клопаты аб народзе, аб яго сёняшнім і заўтрашнім дні.

Клопатамі пра дабрабыт народа прасякнута і прынятая днямі пастанова чэрвеньскага Пленума ЦК КПСС «Аб адмене абавязковых паставак і натураплаты за работы МТС, аб новым парадку, цэнах і ўмовах нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў». Гэтая пастанова не толькі адпавядае надзённым патрэбам камуністычнага будаўніцтва, але і адкрывае вялікія перспектывы для далейшага руху наперад нашай краіны. Характарызуючы мерапрыемствы, распрацаваныя партыяй і ўрадам, таварыш М. С. Хрушчоў адзначыў у сваім дакладзе:

«Пытанні, якія пастаўлены на абмеркаванне гэтага Пленума ЦК, маюць важнейшае значэнне для ажыццяўлення вялікіх планаў камуністычнага будаўніцтва. Яны закранаюць інтарэсы нашай дзяржавы, усяго савецкага народа.

Правільная палітыка нарыхтовак і цэн з'яўляецца адным з асноўных эканамічных рычагоў у развіцці народнай гаспадаркі, у павышэнні дабрабыту працоўных, у далейшым умацаванні магутнасці Савецкай дзяржавы».

Як вядома, шляхі пасляваеннага развіцця нашай сельскай гаспадаркі былі складанымі і нялёгкімі. Калгаснаму сялянству разам з усім савецкім народам давялося прыкласці многа сіл і намаганняў, каб залячыць раны вайны, пашырыць плошчы пасеваў, павялічыць валавы збор збожжа. Але якімі б не былі цяжкасці, працаўнікі сацыялістычных палёў заўсёды мужна пераадольвалі іх, упарта змагаліся за паляпшэнне становішча земляробства і жывёлагадоўлі. Асаблівы парыў энтузіязму і стваральнай працы ахапіў калгаснае сялянства, калі гістарычны верасневскі Пленум ЦК КПСС (1953 год) прыняў грандыёзную праграму па далейшаму ўздыму сельскай гаспадаркі. Новы этап калгаснага будаўніцтва, пачаты пасля верасневскіх рашэнняў партыі, адзначаны бліскучымі перамогамі, шпаркім ростам усіх галін сельскагаспадарчай вытворчасці. У гэты перыяд партыя і ўрад прынялі шэраг новых захадаў, накіраваных на паляпшэнне спраў у калгаснай вёсцы. Найвялікшае значэнне мела рашэнне аб рэарганізацыі машынна-трактарных станцый і далейшым умацаванні калгаснага ладу. Перадача сельскагаспадарчай тэхнікі калгасам, умацаванне іх кваліфікаванымі кадрамі, увядзенне новага парадку планавання ў калгасах і саўгасах, развіццё ініцыятывы калгаснікаў і павышэнне іх матэрыяльнай зацікаўленасці — усё гэта паспяхова служыць вялікай мэце, дае плённыя вынікі.

З пастановы чэрвеньскага Пленума ЦК КПСС нам было прыемна даведацца, што намаганні працаўнікоў сельскай гаспадаркі нашай краіны дагнаць у бліжэйшыя гады Злучаныя Штаты Амерыкі па вытворчасці мяса, малака і масла на душу насельніцтва паспяхова ажыццяўляюцца. Так, вытворчасць малака ў 1957 годзе склала ўжо каля 95 працэнтаў ад вытворчасці ЗША, а вытворчасць жывёльнага масла стала крыху вышэйшай, чым у ЗША. Наша краіна пераўзыходзіць ужо Злучаныя Штаты Амерыкі па аб'ёму вытворчасці пшаніцы ў два з лішнім разы, па вытворчасці цукровых буракоў—прыкладна ў тры разы, па вытворчасці воўны—у два з паловай разы. Гэтыя лічбы шмат аб чым сведчаць, і калгаснае сялянства, прадаўжаючы нарошчваць тэмпы сваёй працы, упэўнена, што сваю задачу — дагнаць ЗША па вытворчасці мяса, малака і масла на душу насельніцтва — яно паспяхова выканае.

Далейшаму бурнаму росквіту сельскагаспадарчай вытворчасці самым актыўным чынам паслужаць рашэнні чэрвеньскага Пленума ЦК КПСС. У калгасах яшчэ вышэй узрастуць даходы, расшырыцца вытворчасць, яшчэ больш умацуецца грамадская гаспадарка. Адмена абавязковых паставак і натуральнай аплаты за работы МТС, увядзенне новага парадку і ўмоў нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў будуць садзейнічаць далейшаму развіццю ініцыятывы калгасаў і калгаснікаў у найбольш эфектным выкарыстанні зямлі, тэхнікі, павышэнні прадуктыўнасці працы, атрыманню большай колькасці валавой і таварнай прадукцыі, зніжэнню яе сабекошту. Усё гэта дазволіць палепшыць забеспячэнне насельніцтва краіны прадуктамі харчавання, а прамысловасць—сыравінай, дасць магчымасць праводзіць далейшае зніжэнне нарыхтоўчых цэн на сельскагаспадарчыя прадукты і дзяржаўных рознічных цэн на тавары народнага спажывання.

Нарыхтоўкі сельскагаспадарчых прадуктаў складаюць адно з важнейшых звеньяў эканамічных сувязей паміж вёскай і горадам, паміж калгасным сялянствам і рабочым класам, а таксама паміж асобнымі раёнамі і цэлымі рэспублікамі нашай краіны. Ажыццяўленне намечаных партыяй мерапрыемстваў у галіне новага парадку нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў—яшчэ адно праяўленне клопатаў аб умацаванні сувязей паміж рабочым класам і калгасным сялянствам, аб далейшым уздыме эканомікі нацыянальных рэспублік Савецкага Саюза, умацаванні дружбы паміж імі.

Савецкі народ гарачым адабрэннем сустрэў мудрае рашэнне нашай партыі. Гэтае рашэнне выклікала новы працоўны і палітычны ўздым сярод працоўных, натхняе на новыя перамогі. Асабліва вялікім уздымам ахоплены ў гэтыя дні працаўнікі калгаснай вёскі. На клопаты сваёй роднай партыі яны адказваюць самаадданай працай на палях і жывёлагадоўчых фермах, дамагаюцца таго, каб стварыць багацці разнастайных сельскагаспадарчых прадуктаў.

Пастанова Пленума ЦК КПСС ставіць вялікія задачы і перад работнікамі ідэалагічнага фронта. Рашэнні партыі трэба данесці ў гушчыню мас, трэба дзейсна дапамагчы працаўнікам палёў у барацьбе за высокія ўраджаі, за ўздым жывёлагадоўлі, за новыя поспехі ў развіцці ўсіх галін сельскагаспадарчай вытворчасці. У гэтай справе шмат што могуць зрабіць работнікі клубаў і хат-чыталень, дамоў культуры і бібліятэк. Ім трэба бліжэй быць да жыцця і патрэб народа, пабольш чытаць лекцый і дакладаў, часцей практыкаваць выступленні агітбрыгад і мастацкіх калектываў, палепшыць наглядную агітацыю, нястомна прапагандаваць у масах сельскагаспадарчыя веды і вопыт перадавікоў. Ды не толькі работнікі культасветных устаноў, а і творчыя работнікі нашай рэспублікі могуць шмат што зрабіць новага, каб дапамагчы калгаснаму сялянству ў змаганні за далейшы ўздым сельскай гаспадаркі. Новыя вершы і апавяданні, нарысы і публіцыстычныя артыкулы на тэмы калгаснага жыцця, выступленні артыстаў перад працаўнікамі палёў — усё гэта аператыўна і добра можа паслужыць вялікай справе, будзе выхоўваць і натхняць людзей калгаснай вёскі.

Рашэнні чэрвеньскага Пленума ЦК КПСС маюць велізарнае значэнне не толькі для справы далейшага росквіту калгаснага ладу, але і для справы развіцця ўсёй эканомікі Савецкай краіны, для нашай барацьбы за камунізм. Гэтыя рашэнні закранаюць шырокія сферы нашага жыцця, і таму кожны савецкі чалавек прыняў іх блізка да сэрца і поўны жадання актыўна садзейнічаць іх ажыццяўленню.

На палескіх прасторах

Вясна гэтага года выдалася на Палессі, як і ва ўсёй рэспубліцы, незвычайна цяжкая, неспрыяльная для веснавой сяўбы. Спачатку сеяць перашкаджалі халады, затым неадольнай перашкодай усталі небывалыя разлівы рэк. Самыя старыя вясковыя дзяды не памятаюць такой паводкі, як сёлетняя. Узровень рэк дасягаў метак, якіх гідраметрычная служба не адзначала на працягу апошніх сямідзесяці год. Былі залітыя вадой дзесяткі вёсак, палі, лугі, прычым паводка была ўстойлівай, трымалася не як звычайна, кароткі час, а больш за месяц, вада спадала павольна. Мы праязджалі па Прыдняпроўю ў канцы мая, а Дняпро быццам і не збіраўся вяртацца ў берагі. Па самыя галіны ў вадзе высіліся адзінокія дубы на лугах, тырчэлі з вады вяршыні прыбярэжных лазнякоў.

Сёлета беларускі народ рыхтуецца адзначаць сваё вялікае свята — 40-годдзе БССР. Калгаснікі імкнуцца сустрэць гэтую знамянальную дату новымі гаспадарчымі поспехамі, высокім ураджаем. І, натуральна, мяне ў гэтай паездцы перш за ўсё хвалявала пытанне: як калгаснікі справіліся з пасяўной, ці не сарвала стыхія веснавых палявых работ? Тым больш, што сёлетняя вясна прынесла вёсцы вялікія змены. Як гэтыя змены адбіліся на арганізацыі работ у калгасах, ці здолелі калгаснікі выкарыстаць свае перавагі, стаўшы паўнапраўнымі гаспадарамі тэхнікі пасля рэарганізацыі МТС?

У горад Рэчыцу мы прыехалі ў другой палове дня. Каля будынка райкома партыі стаяла чарада легкавых аўтамашын — усюдыходы-«газікі», «пабеды» і нават прыгажуні «волгі».

— Своечасова прыехалі, — гаворыць сакратар Рэчыцкага райкома партыі Парфен Фёдаравіч Ахраменка. — Адразу пазнаёміцеся са становішчам у раёне. Сабраліся ўсе нашы старшыні калгасаў, будзем раіцца, як паскорыць завяршэнне сяўбы.

Па сваіх гаспадарчых поспехах Рэчыцкі раён лічыцца ў вобласці сярэднім, але раён гэты перспектыўны, хутка расце эканамічна. Ужо зараз тут з 24-х калгасаў 16—мільянеры. Нягледзячы на ўсе цяжкасці вясны, — сяўбу тут пачалі дзён на 20 пазней, чым у мінулым годзе, — пасяўная сёлета праходзіла больш хутка, энергічна, у сціслыя тэрміны. І ўсё ж на той час у многіх калгасах былі яшчэ недасеяны дзесяткі гектараў такіх важнейшых культур, як лён, кукуруза, бульба, грэчка. У чаканні пакуль падсохне зямля, каб было магчыма сеяць, былі прапушчаны тэрміны, і цяпер трэба было наганяць час.

Нарада праходзіла па-дзелавому, аператыўна. Старшыні калгасаў адзін за другім уставалі і па чарзе дакладвалі аб становішчы спраў у сваіх калгасах.

—У якой дапамозе раённых арганізацый або МТС мае патрэбу ваш калгас, каб сяўба была закончана ў бліжэйшы тэрмін, не пазней 1-га чэрвеня? — пытаўся сакратар райкома.

Калі дапамога была неабходна — ці то ў калгасе не хапала насення, ці была патрэба ў машынах, — тут жа, на месцы, аператыўна вырашалася пытанне, хто і калі акажа патрэбную дапамогу калгасу. Доўга размаўляць не было часу — кіраўнікі раёна даведаліся, што Віцебская вобласць, адна з паўночных у рэспубліцы, з якой спаборнічае Гомельшчына, абагнала іх па сяўбе яравых. І відаць было, што ўсе ўдзельнікі нарады з болем перажывалі гэтую навіну. Так, падвяла сёлетняя вясной палешукоў прырода!.. Але справу можна падправіць, трэба толькі пастаракацца.

Слухаючы адно за другім выступленні старшынь калгасаў, нельга было не адзначыць адну надзвычай цікавую асаблівасць: непазнавальна змяніліся за апошнія чатыры-пяць гадоў кадры кіраўнікоў калгасаў. У нябыт адыйшоў час, калі на чале сельгасарцеляў стаялі выпадковыя, часамі проста малапісьменныя людзі, калі ў калгасы—чаго грахі таіць! — бывала, пасылалі людзей з раёна ў пакаранне за якія-небудзь «грахі».

Цяпер гэта былі, як па падбор, сапраўдныя калгасныя важакі, людзі з вялікай жыццёвай і гаспадарчай практыкай, якія добра ведалі сваю справу кіраўніка. А які ў кожнага размах, якое пачуццё ўласнай годнасці! Ды гэта і не дзіўна: амаль усе яны з'яўляюцца кіраўнікамі буйнейшых шматгалінных гаспадарак з вялікай кольскасцю зямлі, з буйнымі жывёлагадоўчымі фермамі, са сваімі машынна-трактарнымі гаспадаркамі. Гадавыя даходы ў некаторых калгасах дасягаюць васьмі мільёнаў рублёў.

Вось, напрыклад, старшыня аднаго з перадавых у раёне калгасаў «Савецкая Беларусь» Пятро Паўлавіч Шклярэнка. У мінулым гэта — дырэктар саўгаса, чалавек вялікага практычнага вопыту, умелы кіраўнік і гаспадар. За пяць няпоўных год работы ў калгасе ён здолеў адсталую і занядбаную гаспадарку ператварыць у багацейшую сельгасарцель з гадавым даходам амаль да 8 мільёнаў рублёў. У арцелі ёсць свая электрастанцыя, буйнейшыя жывёлагадоўчыя фермы, трынаццаць трактароў, пяць камбайнаў. Калгас трымае першынство ў раёне па надою малака і выхаду мяса на сто гектараў зямельных угоддзяў. У калгасе ўведзена штомесячнае авансаванне на працадні — па 5 рублёў, а ўсяго на працадзень калгаснікі ў мінулым годзе атрымалі ў сярэднім па 11 рублёў грашыма, 2 кг збожжа, 3,5 кг бульбы, 0,5 кг гародніны і г. д. За поспехі ў рабоце Пятро Паўлавіч нядаўна адзначаны вышэйшай урадавай узнагародай — ордэнам Леніна.

Вось другі старшыня, з калгаса «40 год Кастрычніка»—Антон Сяргеевіч Волкаў. Камуніст, падпалкоўнік у адстаўцы, гэты чалавек з'яўляецца сапраўдным энтузіястам калгаснай справы, паказаў сябе выдатным арганізатарам і кіраўніком буйнага і цяпер хутка растучага калгаса.

Адным словам, адчуваецца, што жыццёвае паступова адабрала і высунула кіраўнікамі калгасаў сапраўдных важакоў, сумленных і адданых калгаснай справе камуністаў, адукаваных людзей. Гэта — адна з радасных і значных прыкмет таго новага, што сёлета можна ўбачыць на Палессі.

— Здзіўляецеся, як сёлетняй цяжкай вясной калгасы ўправяцца з пасяўной? — пасля нарады сказаў сакратар райкома.— Уся справа ў рэарганізацыі МТС. Вы нават не ўяўляеце, як змянілася становішча ў калгасах пасля таго, як яны сталі паўнапраўнымі гаспадарамі тэхнікі. Зрэшты, што дарэмна гаварыць, лепш за ўсё паглядзіце самі. Праедзьце, скажам... ну, хоць бы ў калгас імя Кірава, дзе ў нас старшынёй Сцяпан Яфрэмавіч Драгун.

І вось назаўтра, праехаўшы ад райцэнтра кіламетраў дваццаць па нялёгкай прасёлачнай дарозе, мы ў калгасе імя Кірава. Гэта буйнейшая шматгалінная сельгасарцель, якая аб'ядноўвае 820 сем'яў, што пражываюць звыш чым у 10 населеных пунктах. У калгасе адной толькі ворыўнай зямлі 3.200 гектараў, а ўсяго зямельных угоддзяў 5 тысяч гектараў. Пяць год таму назад гэта быў адзін з самых занядбаных у раёне калгасаў, гаспадарка, як кажуць, тут «дыхала на ладан». Увесь грашовы прыбытак калгаса за год не перавышаў 400 тысяч рублёў. У сельгасарцелі была адна старэнькая машына. Вясною на фермах штогод ад бяскорміцы гінулі дзесяткі галоў жывёлы...

Пасля вядомых рашэнняў партыі аб умацаванні калгасаў тут адбыліся перамены, якія да непазнавальнасці змянілі справы ў калгасе. Сельгасарцель узначаліў пасланец партыі Сцяпан Яфрэмавіч Драгун. Гэты энергічны, здольны гаспадарнік паказаў такое ўмельства працаваць з людзьмі, натхніць іх, што ўжо ў першы год справы ў калгасе рэзка пайшлі ўгору. Новае праўленне перш за ўсё правяла клопаты аб ураджаі. На палі было вывезена тысячы тон торфу, гною. Аграномы, якія прыйшлі ў калгас, пачалі вывучаць зямлю, устанавілі правільны севазварот. Калгас на вялікіх плошчах пачаў вырошчваць такія выгадныя культуры, як лён, кукуруза.

Добры догляд палёў, багатае ўгнаенне адразу зрабілі свой прыкметны ўплыў на ўраджай. Павысіліся надоі малака, павялічыліся грашовыя прыбыткі калгаса і, натуральна, пачала расці і аплата працадня. А гэта ў сваю чаргу палепшыла працоўную дысцыпліну, натхніла калгаснікаў на лепшую, больш старанную працу.

Так калгас з году ў год упэўнена ішоў ад поспеху к поспеху і праз якіх чатыры гады ператварыўся ў выдатную, багатую гаспадарку, адну з перадавых у раёне. У 1957 годзе сярэдні ўраджай збожжавых у калгасе ўжо быў 9,6 цэнтнера з гектара, а на асушаных тарфяніках даходзіў да 22 цэнтнераў. Грашовы даход калгаса перавысіў 5 мільёнаў рублёў.

За гэтыя гады сельгасарцель правяла вялікае будаўніцтва. Пабудаваны чатыры вялікія тыпавыя кароўнікі, абсталяваныя аўтапаілкамі, падвясной дарогай для развозкі кармоў, кормазапарнікамі. Пабудаваны тры цялятнікі на чатырыста галоў маладняку, два поўнасцю механізаваныя свінарнікі, дзве канюшні, склад для збожжа, птушнік, сіласная вежа на 2 тысячы тон сіласу. Пабудавана пяць клубаў у вёсках. Набыта і ўстаноўлена чатыры ветрарухавікі для воданапорных вежаў, гараж. Пабудавана свая станцыя на 50 кілават, піларама, млын, ільнозавод. Дамы калгаснікаў электрыфікаваны, у кожнай хаце — радыё.

Калгас набыў 10 аўтамашын, 10 трактароў, 4 камбайны, 3 бульбаўборачныя машыны.

А як вырасла аплата працадня! У мінулым годзе калгаснікі ў сярэднім атрымалі на працадзень па 10 рублёў грашыма, 2 кг збожжавых, 3,5 кг бульбы, 300 гр гародніны.

Усё гэта дасягнута ўпартай працай калгаснікаў. І па ўсім відаць, што калгас не збіраецца спыняцца на дасягнутым, а ўвесь у росце, у руху, з году ў год набірае сілы, і перспектывы яго развіцця такія, што не могуць не натхняць і не радаваць калгаснікаў.

...Восем гадзін раніцы. На калгасным двары, непадалёк ад вежы ветрарухавіка, сабраліся для атрымання нарадаў на работу брыгадзіры, калгаснікі, трактарысты, шафёры.

— Вось, Пятро Міхайлавіч,—гаворыць старшыня калгаса, звяртаючыся да брыгадзіра трактарыстаў, — давай аднаго «Беларуса» на вывазку леса, два пашлі вазіць гной, а ўсе астатнія стаў на ворыва — часу ў нас да заканчэння сяўбы два дні засталося. Задача зразумела?

— Усё зразумела. За намі, Сцяпан Яфрэмавіч, справа не стане, — усміхаючыся адказвае брыгадзір і разам з групай трактарыстаў накіроўваецца да стаянкі трактароў.

— Бачылі, як у нас зараз з трактарамі? — размеркаваўшы нарады і павольна ідучы да будаўніцтва новага кароўніка, задаволена гаворыць старшыня. — Самі гаспадары сталі — інакш справа пайшла. Ніякіх дыскусій. А бывала ж не мы, а яны тут распараджаліся,—хачу—паеду, хачу—не паеду, — там, бачыце, яму араць выгадна, а там — не. Нават гаварыць з імі цяжка было. Па мінулагодняму дык мы б сёлета з пасяўной і да паловы чэрвеня не справіліся... Ды ўлічыце яшчэ і такое — у мінулым годзе ў нас толькі 35 працэнтаў веснавых работ было зроблена трактарамі. Усё астатняе — на конным цягле. А зараз усё наадварот стала — 25 працэнтаў коньмі ўзаралі, а 75 — трактарамі. Красамоўная лічба, а?

Лічба, сапраўды, была пераканаўчая. У падмацаванне старшыня прывёў дзесяткі прыкладаў, калі магчымасць самастойна і аператыўна распараджацца тэхнікай літаральна выручала калгас.

— Я вам так скажу, — шчыра закончыў Сцяпан Яфрэмавіч, — гэтай пераменай партыя моцна дапамагла калгасам, паставіла іх на ўласныя ногі. Але, думаю, што і мы таксама ў даўгу не застанемся перад роднай дзяржавай — чым здолеем, аддзякуем: хлебам, малаком, мясам. Вось паставіла партыя перад намі задачу абагнаць Амерыку па вытворчасці мяса і малака. Смела кажу—прыязджайце да нас праз год-два: будзе выканана гэтая задача!

Калгас імя Кірава не якая-небудзь выключная гаспадарка на Гомельшчыне. Цяпер тут у кожным раёне такіх сельгасарцелей—дзесяткі. Адны больш багатыя, другія бяднейшыя, але і тыя і другія ўпэўнена ідуць угору, хутка растуць і ўмацоўваюцца. Калгаснікі Палесся, як і ўсёй рэспублікі, сустракаюць 40-годдзе БССР вялікімі гаспадарчымі поспехамі.

І гэта самае знамянальнае, самае радаснае, што можна назіраць цяпер у любой беларускай вёсцы.

Усевалад КРАЎЧАНКА.

НАСУСТРАЧ 40-ГОДДЗЮ БССР

Лекторый для моладзі

У Бабруйску арганізаваны пастаянна-дзеючы лекторый па літаратуры, музыцы і жывапісу. Ужо на першую лекцыю прыйшло звыш 300 чалавек. З вялікай цікавасцю і ўвагай яны слухалі лекцыю-канцэрт «Руская народная песня».

З такой жа цікавасцю была праслухана чарговая лекцыя на тэму: «Беларуская літаратура за 40 год», якую прачытаў педагог 18-й сярэдняй школы тав. Касцян.

Лекторый вельмі папулярны ў горадзе. Асабліва ахвотна наведвае яго моладзь. За тры месяцы было прачытана 12 лекцый.

У сувязі з 40-годдзем БССР будзе прачытаны рад лекцый аб дасягненнях літаратуры і мастацтва ў нашай рэспубліцы, напрыклад, «Музычная творчасць беларускіх кампазітараў», «Народныя паэты Якуб Колас і Янка Купала». Намечана таксама правесці вялікі літаратурны вечар з удзелам беларускіх пісьменнікаў.

У чытанні лекцый прымаюць актыўны ўдзел педагогі і музыказнаўцы горада — Т. Кузьміна, Т. Піскунова, А. Гейне і інш. Лекцыі прахо дзяць цікава. У час лекцый па музыцы выконваюцца творы кампазітараў, лекцыі на літаратурныя тэмы суправаджаюцца мастацкім чытаннем.

А. КАГАН.

Творчыя справаздачы

Рыхтуючыся дастойна сустрэць 40-ю гадавіну Беларускай ССР, работнікі культурна-асветных устаноў Магілёўскай вобласці ўзялі на сябе павышаныя абавязацельствы і выклікалі на спаборніцтва работнікаў культуры Віцебшчыны.

За апошні час наглядаецца значнае ажыўленне ў рабоце ўстаноў культуры вобласці. Амаль ва ўсіх клубах і бібліятэках абноўлена наглядная агітацыя. Афармлены стэнды, мантажы, вітрыны на тэмы: «Савецкая Беларусь за 40 год», «40-годдзю Савецкай Беларусі—дастойную сустрэчу».

Узяць, напрыклад, Вендржскі сельскі клуб Магілёўскага раёна (загадчык клуба П. Майсеенка). Тэрыторыя клуба вясной гэтага года была азеляніна і абгароджана, разбіты клумбы, пасаджаны кветкі. Памяшканне клуба добра афармлена канкрэтнай наглядная агітацыяй. Лозунгі заклікаюць калгаснікаў сустрэць 40-ю гадавіну Савецкай Беларусі новымі працоўнымі поспехамі. Ёсць у клубе фотамантаж «Савецкая Беларусь за 40 год» і інш.

Абноўлена наглядная агітацыя ў Фашчаўскім сельскім клубе Шклоўскага раёна, Тросцінскай сельскай бібліятэцы Хоцімскага раёна і г. д.

Уключыўшыся ў сацыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу 40-й гадавіны БССР, многія ўстановы культуры сталі працаваць значна лепш. Так, напрыклад, доўгі час дрэнна працавала Касцюшкаўская хата-чытальня Крычаўскага раёна. Цяпер тут створаны і працуюць гурткі: драматычны, харавы і танцавальны. Падрыхтавана да пастаноўкі ўжо некалькі канцэртаў.

Цяпер у раёнах вобласці праходзяць агляды мастацкай самадзейнасці. Добра прайшоў агляд у Чэрыкаўскім раёне, у ім прынялі ўдзел гурткі раённага Дома культуры і калектывы мастацкай самадзейнасці амаль усіх клубных устаноў. Гэта была сапраўды творчая справаздача мастацкай самадзейнасці раёна. Разнастайны рэпертуар, у якім пераважалі творы беларускіх кампазітараў і паэтаў, гаворыць аб сур'ёзнай і карпатлівай рабоце, якую правялі работнікі культуры раёна.

Таксама добра прайшлі справаздачныя канцэрты мастацкай самадзейнасці ў Клімавіцкім, Магілёўскім, Асіповіцкім і радзе іншых раёнаў.

І. ЦЫГАНКОЎ,
старшы інспектар Магілёўскага абласнога ўпраўлення культуры.

Стараецца беларускі цыркавы калектыў

Да 40-годдзя БССР у культурным жыцці нашай рэспублікі адбудуцца дзве значныя падзеі: будзе створаны беларускі нацыянальны цыркавы калектыў і адкрыецца новы, стацыянарны будынак Мінскага дзяржцырка — адзін з лепшых цыркавых будынкаў у Еўропе.

Арганізацыя беларускага цыркавога калектыву і падрыхтоўка яго першай праграмы, якая будзе прысвечана слаўнай юбілейнай даце, ускладзена на Цэнтральную студыю цыркавога мастацтва і дырэкцыю Мінскага дзяржцырка.

У склад праграмы беларускага цырка ўжо цяпер арыентыровачна ўключаны 14 лепшых нумароў цыркавога канвеера. Сярод іх: група эквілібрыстаў на шастах і лесвіцах пад кіраўніцтвам заслужанага артыста БССР Е. Мілаева, «Марскія ільвы і купальнічыцы» пад кіраўніцтвам артыста І. Сідоркіна, музычныя клаунады ў выкананні артыста В. Каваленкі, група паветраных гімнастаў пад кіраўніцтвам артыста А. Вязава і рад іншых нумароў.

□

Гутарка з дырэктарам Мінскага дзяржцырка заслужаным дзеячам мастацтва БССР Б. Е. Кабішчарам

□

Пралог і эпілог праграмы беларускага цыркавога калектыву будуць прысвечаны саракагоддзю рэспублікі. У іх будуць адлюстраваны выдатныя поспехі беларускага народа за 40 год.

У склад пастановачнай групы намечана запрасіць: рэжысёра-кансультанта В. Пацехіна, пісьменнікаў К. Кірэенку, Ул. Корбана, В. Зуба, М. Алтухова, балетмайстра С. Грабеншчыкава, мастака П. Масленікава, кампазітара Ю. Бельзацкага. Галоўным рэжысёрам-пастаноўшчыкам зацверджаны А. Арнольд.

Цяпер праводзіцца работа па выяўленню з ліку маладых артыстаў Беларусі здольных выканаўцаў цыркавых нумароў.

У сувязі з арганізацыяй беларускага цыркавога калектыву Міністэрства культуры БССР і Усесаюзнае аб'яднанне дзяржаўных цыркаў аб'явілі конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па наступных жанрах: акрабатыцы, танцавальна-акрабатычнаму жанру, сатыры, клаунадзе і музычнай эксцэнтрыцы. У конкурсе змогуць прыняць удзел не толькі прафесіянальныя артысты, але і ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці. Усе, хто пройдзе па конкурсу, будуць прыняты на работу ў Дзяржаўны беларускі цыркавы калектыў.

Журы конкурсу зацверджана ў складзе дзевяці чалавек (старшыня Я. Рамановіч).

Ва ўсёй гэтай вялікай і складанай рабоце па стварэнню беларускага цыркавога калектыву, падрыхтоўцы праграмы, падборы рэпертуару і кадраў павінна нам аказаць актыўную, практычную дапамогу Упраўленне па справах мастацтва Міністэрства культуры БССР.

Стварэнне нацыянальнага цыркавога калектыву, пабудова цудоўнага будынка цырка з'яўляецца яшчэ адным праяўленнем нястомных клопатаў Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада аб далейшым павышэнні культуры беларускага народа.

Міжбібліятэчны абанемент бібліятэкі імя Ул. І. Леніна прыступіў да камплектавання кніг да 40-годдзя БССР.

На здымку: старшы бібліятэкар А. Карпенка і памочнік бібліятэкара Р. Зіневіч за камплектаваннем.

Фота Ул. Крука.

Выступление артыстаў эстрады

У гарадскім парку райцэнтра Крупкі адбыўся канцэрт артыстаў Беларускай дзяржаўнай эстрады. Былі выкананы беларускія, рускія песні, а таксама песні народаў СССР. Канцэрт прайшоў з вялікім поспехам.

Абменныя канцэрты

У культурна-асветных установах Акцябрскага раёна шырока разгорнута падрыхтоўка да 40-годдзя Савецкай Беларусі. Ва ўсіх клубах, хатах-чытальнях будуць праведзены агляды мастацкай самадзейнасці ў гонар слаўнага свята. Правядзенню такіх аглядаў з мэтай уцягнення ў калектывы мастацкай самадзейнасці большасці працоўных, выяўленню лепшых і здольных выканаўцаў песень, танцаў і іншых жанраў папярэднічае арганізацыя абменных канцэртаў сельскіх устаноў культуры.

Толькі ў чэрвені месяцы Шкаўскі сельскі клуб абмяняўся канцэртамі з Аземлянскім сельскім клубам, Лапавіцкі з Курынскім, Ляскавіцкі з Парэцкім.

Да правядзення абменных канцэртаў рыхтуюцца і ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці раённага Дома культуры. Артысты наведаюць суседнія раёны — Парыцкі, Глускі і іншыя.

І. АБАБУРКА.

Іграе духавы аркестр

Прафсаюзная арганізацыя трэцяй дыстанцыі пуці Беларускай чыгункі набыла камплект духавога аркестра. Сярод рабочых, вучняў і моладзі калгаса «Ленінскі шлях» знайшлося многа жадаючых займацца ў гуртку духавой музыкі.

Пад кіраўніцтвам В. Чабанава гурткоўцы азнаёміліся з музычнай граматай, асвоілі тэхніку ігры. Цяпер аркестр выконвае каля 90 твораў беларускіх, рускіх і зарубежных кампазітараў.

У суботнія і нядзельныя вечары самадзейныя аркестранты іграюць у клубе на танцавальных вечарах моладзі. Яны часта выступаюць таксама ў Бярозаўскім Доме культуры і ў клубах бліжэйшых калгасаў.

Рыхтуючыся да свята 40-годдзя Беларускай ССР, самадзейныя музыканты развучваюць новыя творы.

А. БУРОМСКІ.

Свята „Дружба народаў"

У сяле Міхайлаўскім Пскоўскай вобласці адбылося свята «Дружба народаў». У свяце прыняў удзел калектыў мастацкай самадзейнасці г. Віцебска.

Пасля ўрачыстага адкрыцця быў дадзены вялікі канцэрт, у якім ўдзельнічалі беларускія самадзейныя артысты. Рабочы завода імя Кірава Н. Каржанёў прачытаў урывак з паэмы «Новая зямля» Я. Коласа, метадыст Дома народнай творчасці А. Саможнева — байкі Ул. Корбана. Беларускія народныя песні выканала Г. Валуева.

Н. ТЫШЭВІЧ.

Новыя клубы

У сельгасарцелях Радунскага раёна будуюцца калгасныя клубы. Зараз амаль кожны калгас мае свой клуб. Не так даўно здан у эксплуатацыю клуб у сельгасарцелі імя Я. Купалы. Новы клуб пабудаваны таксама ў калгасе імя Кірава. Кожны з гэтых клубаў мае глядзельную залу на 200 месц, сцэну, стацыянарную кінаўстаноўку.

Н. ТУМАНАЎ.

У час палявых работ

У гэтыя дні вялікую ўвагу рабоце агітацыйна-мастацкіх брыгад надаюць работнікі Стаўбцоўскага раённага Дома культуры. У задачу брыгад уваходзяць выступленні перад калгаснікамі ў час палявых работ. У раёне ўжо арганізавана 12 брыгад. Так, толькі агітбрыгада Дома культуры ў гэтым годзе дала каля 20 канцэртаў, наведаўшы калгасы «Краіна Саветаў», «Радзіма Я. Коласа» і інш. Дзе б не паяўляліся самадзейныя артысты, усюды іх чакаў сардэчны прыём.

Каб выступленні былі змястоўнымі і цікавымі, работнікі Дома культуры своечасова пакланаціліся аб абнаўленні канцэртнай праграмы. У яе ўключаны новыя песні і вершы савецкіх кампазітараў.

ДНІ ПОЛЬСКАЙ КУЛЬТУРЫ Ў БЕЛАРУСІ

Вопыт цудоўнага калектыву

(Думкі пасля канцэртаў Пазнанскага хору)

Значная падзея ў музычным жыцці Мінска — выступленні Пазнанскага хору пад кіраўніцтвам Стэфана Стулігроша ўжо знайшла сваё адлюстраванне ў нашым друку. Поўнасцю далучаючыся да высокай агульнай ацэнкі, якая дадзена гэтаму выдатнаму самадзейнаму калектыву, мы не будзем паўтараць выказаных рэцэнзентамі ў яго адрас заслужаных пахвал. Тут хочацца падзяліцца думкамі, якія, побач з творчымі эмоцыямі, хвалявалі аўтара гэтых радкоў на канцэртах цудоўнага польскага хору, — цудоўнага не толькі па сваіх высокіх творчых якасцях, але і па асабоваму складу, які аб'ядноўвае ў сабе тры мужчынскія пакаленні.

Цяпер, калі пытанні далейшага развіцця нашай харавой культуры пастаўлены з усёй вастрынёй, калі арганізуецца рэспубліканскае харавое таварыства і павышаецца ўзровень выкладання музыкі ў агульна-адукацыйных школах, прыклад хору, які складаецца ў сваёй аснове з хлопчыкаў-школьнікаў, — прыклад таленавітага музыканта-выхавацеля Стэфана Стулігроша можа быць і для нас вельмі павучальным.

Нягледзячы на пастаянны колькасны і якасны рост нашай харавой самадзейнасці, мы на кожным кроку сустракаемся з прыкрай з'явай — з недахопам у калектывах мужчынскіх галасоў. Нават у некаторых нашых вядомых хорах мужчынскія галасы ёсць, як кажуць, у народзе, «толькі на завод». Такая дыспрапорцыя ў партыях вельмі абмяжоўвае выканаўчыя магчымасці хору, парушае яго агульны ансамбль, вымушае мужчынскую групу да фарсіравання гуку. Дзе ж прычына такой ненармальнасці?

Возьмем любы школьны хор. Колькасць вучняў у школе — дзяўчатак і хлопчыкаў, — прыкладна, аднолькавая, а якія працэнтныя суадносіны хлопчыкаў у школьных хорах? Мізэрныя! Нават у хорах музычных школ, дзе пытанне ўдзелу хлопчыкаў у хорах павінна разглядацца з прафесіянальных пазіцый, у гэтых адносінах справа абстаіць не намнога лепш. Адзін настаўнік музычнай школы спрабаваў растлумачыць гэтую з'яву тым, што быццам бы хлопчыкі нібы менш музычныя ў параўнанні з дзяўчаткамі (?!). Вядома, такое меркаванне не вытрымлівае ніякай крытыкі, асабліва ў адносінах да школы, дзе музычнасць павінна быць рашаючым крытэрыем пры наборы вучняў. Прычыны гэтай анамаліі трэба шукаць у іншым. Хлопчыкі ва ўзросце, які нас цікавіць (7—14 год), дастаўляюць больш клопатаў кіраўнікам і настаўнікам, чым дзяўчаткі: яны менш дысцыплінаваныя, іх цяжэй прыбраць да рук. І зноў нельга не ўспомніць С. Стулігроша: творчую і рабочую дысцыпліну яго малых можна паставіць у прыклад любому «даросламу» калектыву!

Утрыманню дысцыпліны ў дзіцячым школьным хоры перашкаджае і ўзроставы «антаганізм» паміж дзяўчаткамі і хлопчыкамі. Адсюль некаторыя «кіраўнікі» прыходзяць да выводу: менш хлопчыкаў у хоры — будзе лягчэй жыць і працаваць. Рашэнне простае, а вынікі?.. Калі хлопчыку не прышчапіць з дзяцінства навыкаў спявання і любві да яго, у сталым узросце яго не зацягнеш у хор і на вяроўцы. Так, не раскрыўшыся ў дзяцінстве, часта вянуць прыродныя вакальныя таленты. Адсюль неадвальняючае камплектаванне вакальных класаў нашай кансерваторыі і адсюль недахоп вакальных сіл (асабліва мужчынскіх галасоў) у оперным тэатры і ў прафесіянальных харавых калектывах.

У бліжэйшы час у Беларусі запланавана арганізацыя харавога вучылішча і стварэнне хору хлопчыкаў з яго вучняў. Гэта вельмі важнае для падрыхтоўкі прафесіянальных кадраў спевакоў і кіраўнікоў хораў мерапрыемства, вядома, не вырашыць яшчэ праблемы развіцця харавога мастацтва ў масавых маштабах. Дапамагчы гэтай справе неабходна пры дапамозе арганізацыі гарадскіх дзіцячых хораў.

Я ўжо не кажу аб стварэнні хору, падобнага Пазнанскаму, г. зн. змешанага з хлопчыкамі, якія замяняюць жаночыя гадасы. Пазнанскі хор не вырас, як птушка-фенікс, з попелу: ён мае старадаўнія традыцыі. Не варта нам захапляцца і «заеурдыненымі» (прыглушанымі) тэмбрамі яго маленькіх спевакоў. Тое, што добра і стылёва для польскага калектыву, які абапіраецца ў сваёй творчасці галоўным чынам на рэпертуар, што складаецца з твораў польскіх майстроў далёкага мінулага, наўрад ці можа быць прыгодна для нас. Для нас (маючы на ўвазе масавае дзіцячае выкананне) будзе больш адпавядаць свабодная манера дзіцячага спявання, падобная той, з якой мы знаёмы па выканаўчай практыцы хору хлопчыкаў пад кіраўніцтвам А. В. Свешнікава і дзіцячага хору Ленінградскай капелы. Трэба адзначыць, што пры выкананні песень С. Манюшкі і апрацовак польскіх народных песень К. Шыманоўскага, у спяванні пазнанскіх хлопчыкаў паявіліся новыя фарбы, неабходныя для перадачы дакладных рытмаў і характэрных інтанацый польскай нацыянальнай музыкі. Разам з тым узмацнілася ўнутраная і знешняя выразнасць, а адсюль і дыкцыя стала больш дакладнай. Як бачым, аблічча калектыву і манеру яго спявання ў значнай ступені вызначае рэпертуар.

У нас ёсць усе магчымасці ўжо ў бліжэйшы час стварыць хоры хлопчыкаў хоць бы ў абласных цэнтрах. Для гэтага тут знойдуцца і падрыхтаваныя энтузіясты-кіраўнікі і бацькі, якія з ахвотай пакіруюць сваіх дзяцей у такія хоры. Вядома, што хор не толькі выхавае мастацкія густы ў дзяцей, але будзе садзейнічаць іх агульнаму выхаванню.

У заключэнне хочацца выказаць пажаданне творчых поспехаў выдатнаму польскаму калектыву і яго кіраўніку. Вопыт сваёй цікавай і плённай работы з хорам С. Стулігрошу варта абагуліць у друкаваным выданні, за што яму будуць удзячны ўсе тыя, каму блізкае і дарагое харавое мастацтва.

Г. ЦІТОВІЧ,
народны артыст БССР.

На здымку: вядомыя артысты польскага балету Б. Бітнеруўна і В. Груца ў час рэпетыцыі.

Хвіліны эстэтычнай асалоды

Многа радасных хвілін і эстэтычнай асалоды даставіў аматарам мастацтва канцэрт польскай камернай музыкі, наладжаны ў мінулую нядзелю ў зале Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Мінчане знаёмы з цудоўнай выканаўчай школай і вялікім майстэрствам польскіх салістаў — вакалістаў, скрыпачоў, піяністаў — па іх папярэдніх выступленнях у беларускай сталіцы. А на гэты раз яны яшчэ больш замацавалі за сабой славу сапраўдных музыкантаў і сур'ёзных прапагандыстаў творчасці нацыянальных кампазітараў.

У першым і другім аддзяленнях выступалі адны і тыя ж артысты, але толькі з разнастайным рэпертуарам. У выкананні салісткі Катовіцкай філармоніі Клары Данецкай прагучалі тры творы з класічнай спадчыны вялікага Шапена. Яго балада, навеяная вобразамі паэмы «Свіцязянка» Міцкевіча, паэтычны накцюрн і быстры, парывісты этюд (до-мінор) выклікалі ў слухача жывы водгук. Піяністка валодае высокай фартэпіяннай тэхнікай і ўмела скарыстоўвае багатыя магчымасці інструмента для раскрыцця зместу шапенаўскіх твораў. Адзінае, што хацелася б бачыць у яе ігры, гэта больш экспрэсіі і глыбокай усхваляванасці. Бліскуча сыграла К. Данецка варыяцыі Шыманоўскага.

З захапленнем было прынята выступленне саліста Вроцлаўскай оперы Францішка Арно. Ён літаральна пакарыў слухачоў незвычайнай сілай і прыгажосцю свайго голасу, натхнёным, тэмпераментным спяваннем. Яго моцны драматычны тэнар гучыць аднолькава роўна і ярка ва ўсіх рэгістрах, што дазваляе спеваку выконваць складаны вакальны рэпертуар. Выдатна праспяваў Ф. Арно дзве арыі Ентэка з оперы «Галька» Манюшкі і рэчытатыў і арыю Стэфана з оперы «Страшны двор» таго ж кампазітара. Спявак паказаў гібкасць голасу, умелае валоданне гукам пры змене розных настрояў у музыцы, пры пераходзе ад вобразаў светлага задумлівага характару да вобразаў, поўных глыбокага драматызма і ўнутранага агня. Добрае вакальнае майстэрства Ф. Арно праявілася і ў выкананні твораў рамансавага характару, — «Восень» Ліпскага, «Доля» Зажыцкага, «Пастухова песня» Невядомскага.

Парадавала сваёй музычнасцю і тонкім артыстызмам салістка Варшаўскай оперы Ядвіга Дзікуўна. Усё яе спяванне было прасякнута вялікім пачуццём, душэўным абаяннем і цеплынёй. Нягледзячы на прыкметную стомленасць у голасе, спявачка так здолела разлічыць свае сілы і магчымасці, прыцягнуць усё сваё майстэрства пры выкананні канцэртных нумароў, што ад яе выступлення ў слухачоў засталіся самыя добрыя ўспаміны. Я. Дзікуўна ўмее знаходзіць найтанчэйшыя нюансы і фарбы для перадачы самых разнастайных па характару і стылю вакальных твораў. Мякка і выразна яна спявае песню «Сумнай дзяўчыне» Карловіча і «Адчыні, Янка» Невядомскага, драматычная усхваляванасць, гарачы парыў і страснасць пачуццяў раскрыты ў вядомай арыі Галькі з аднайменнай оперы Манюшкі, і тут жа побач — своеасаблівае выкананне такіх бесклапотных і лёгкіх па зместу рэчаў, як песенька Катон «Ён стары мой знаёмы» (опера «Казанова» Ружыцкага) і «Карусель» Наўроцкага.

Паспяхова выступіў у канцэрце і лаўрэат Міжнароднага конкурсу імя Веняўскага Зенон Плашай. З творчасці любімага польскага кампазітара скрыпач сыграў паланез і вальс-капрыс, выканаў ён таксама накцюрн і тарантэлу Шыманоўскага. За пранікнёную і ўдумлівую ігру публіка ўзнагародзіла здольнага музыканта шчырымі апладысментамі. Тут жа нельга высока не адзначыць удзелу ў канцэрце выдатнага партнёра выканаўцаў, піяністкі Т. Вайташэўскай, якая, бездакорна акампаніруючы, складала з імі адзін агульны музычны ансамбль.

Пакідаючы канцэртную залу, мы лішні раз маглі пераканацца ў тым, колькі цудоўнага тоіць у сабе польская музыка і якіх дастойных музыкантаў-інтэрпрэтатараў знаходзіць яна ў асобе таленавітых суайчыннікаў.

Г. ЗАГАРОДНІ.

Новыя сустрэчы і знаёмствы

Нашы сябры — удзельнікі Дзён польскай культуры ў Беларусі працягваюць знаёміцца з з жыццём рэспублікі.

Адна з сустрэч пісьменнікаў і гасцей адбылася ў клубе Саюза пісьменнікаў. Са словамі шчырай дружбы да сяброў звярнуўся П. Броўка. Ён расказаў пра тое, як з кожным годам мацнеюць сувязі двух літаратур. Беларускія пісьменнікі перадалі падарункі гасцям: свае новыя кнігі.

Вялікі вечар, прысвечаны польска-савецкай дружбе, адбыўся ў тэатры імя Я. Купалы. Вечар адкрыў міністр культуры БССР Г. Кісялёў. З дакладам аб польска-савецкай дружбе выступіў П. Пестрак. Цёпла сустралі прысутныя выступленне польскага пісьменніка Ераніма Міхальскага. Вершы, прысвечаныя сябрам, прачыталі на вечары П. Броўка, А Зарыцкі, А. Куляшоў, М. Танк.

Удзельнікі Дзён культуры наведалі аўтамабільны завод. Яны пабывалі на галоўным канвееры, пашікавіліся работай інструментальнага цэха.

Члены дэлегацыі прысутнічалі на сімфанічным канцэрце, які быў прысвечаны 50-годдзю з дня смерці М. Рымскага-Корсакава, у тэатры імя Я. Купалы прагледзелі спектакль «Канстанцін Заслонаў».

Польскія сябры ўсклалі вянок ля помніка-абеліска воінам Савецкай Арміі і партызанам, якія загінулі ў баях у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Нас гэта хвалюе

Усім вядомыя поспехі, дасягнутыя нашай краінай у галіне эстэтычнага выхавання. Савецкая школа ўзняла музычную культуру народа. Са сцен яе выходзілі людзі, якія ведаюць не толькі матэматыку і фізіку, хімію і гісторыю, але і музыку, якія маюць густ да добрай песні. Але, нажаль, музычныя зацяткі ў апошнія гады ў школах зведзены да мінімуму.

З кожным годам настаўнікі адчувалі вынікі нездавальняючага стану мастацкага выхавання. Гэта адбівалася не толькі на ўзроўні выкладання спеваў, малявання, але і на развіцці мастацкай самадзейнасці.

Недахопы ў эстэтычным выхаванні школьнікаў прыводзяць да таго, што некаторыя юнакі і дзяўчаты не ўмеюць адрозніць у мастацтве добрае ад дрэннага, захапляюцца часам пошлымі, мяшчанскімі песенькамі і рамансамі, не пазнаёмленыя з класічнымі мастацкіх традыцый і дасягненняў сучаснага мастацтва. Ёсць асобныя вучні, якія хоць і наведваюць сістэматычна кіно і тэатры, канцэртныя залы, чытаюць мастацкую літаратуру, але не валодаюць сапраўднай эстэтычнай культурай.

З кожным годам мы, работнікі асветы, адчувалі адмоўныя бакі адсутнасці правільнай пастаноўкі музычнай адукацыі. У пасляваенны час урокі спеваў былі адноўлены толькі ў пачатковай школе, а некалькі пазней — у пятых і шостых класах. Аднак гэта вялікіх вынікаў не дало, таму што заняткі вялі настаўнікі, якія самі не маюць дастатковай музычнай падрыхтоўкі.

Адсутнасць правільнай пастаноўкі музычнай адукацыі стала прычынай распаўсюджання сярод вучняў дрэнных музычных густаў. Некаторых захапіла не музыка опер, сімфоній, а «мелодыі» кабарэ, накшталт розных факстротаў і іншых лёгкіх танцаў. А яшчэ ж у першыя гады Савецкай улады акадэмік В. П. Пацёмкін перасцерагаў работнікаў асветы ад фармалізму ў мастацкім выхаванні дзяцей. Нельга маляваць, спяваць, займацца музыкай, іграць на сцэне, не ведаючы і не бачачы прыроды з яе фарбамі, не адчуваючы хвалюючых эстэтычных пачуццяў.

Яшчэ ў мінулым навучальным годзе наш педагагічны калектыў, абмяркоўваючы стан эстэтычнага выхавання, намеціў рад практычных мер для яго паляпшэння. Высакародную справу зрабіў калектыў рабочых скурзавода № 4, настаяўшы перад кіраўніцтвам завода аб перадачы нашай школе камплекта духавых інструментаў. Гэтая акалічнасць дазволіла стварыць у школе аркестр. Аб добрым уплыве музыкі гаворыць хаця б такі факт. Па рэкамендацыі педагагічнай і бацькоўскай грамадскасці ў духавы аркестр былі прыняты найбольш недысцыплінаваныя вучні. Заняткі па музыцы, якія праводзіліся пад кіраўніцтвам вопытнага педагога А. Журбія, станоўча адбіліся перш за ўсё на паводзінах дзяцей. Вучні непазнавальна змяніліся. Ад ранейшай гарэзнасці, несур'ёзнасці не засталося і следу. Гэты прыклад можа служыць доказам таго, як спрыяльна дзейнічае на дзяцей музычнае выхаванне.

Больш сур'ёзныя адносіны былі нададзены ўрокам спеваў. Выкладчыцай спеваў была запрошана выпускніца Гродзенскага музычна-педагагічнага вучылішча Н. Улаховіч. У школе арганізаваны два хоры: адзін для вучняў малодшых, а другі для старэйшых класаў.

Мы вітаем рашэнне Міністэрства асветы аб увядзенні ўрокаў спявання ў старэйшых класах. Харавое спяванне ў школе дапамагае ў фармаванні ідэйнага і маральнага аблічча дзяцей. У песні знаходзяць сваё адлюстраванне ідэі патрыятызму.

У апошнія гады ў вучняў з'явілася імкненне да музычнай адукацыі. Многія нашы вучні выхоўваюцца ў музычнай школе. Школа імкнецца стварыць лепшыя ўмовы для іх заняткаў, наладжвае агляды дасягненняў юных музыкантаў.

Эстэтычнаму выхаванню садзейнічаюць школьныя фестывалі, якія штогод праводзяцца. Так, у мінулым навучальным годзе, рыхтуючыся да гарадскога фестывалю, у школе быў аб'яўлены конкурс на лепшую самадзейнасць у піянерскім атрадзе і камсамольскай групе. У гэтым конкурсе прыняла ўдзел вялікая колькасць піянераў і камсамольцаў. Рыхтуючыся да 40-й гадавіны БССР, камітэт камсамола і савет дружыны зноў абвясцілі конкурс на лепшую самадзейнасць класа.

Але як бы добра ні была пастаўлена пазакласная і пазашкольная работа па эстэтычнаму выхаванню, вучэбны працэс у гэтых адносінах мае асаблівае значэнне.

За апошнія гады намі праведзены рад мерапрыемстваў, якія садзейнічаюць паляпшэнню выкладання спеваў. Але ёсць недахопы, якія перашкаджаюць рабоце. Як вядома, вучэбны працэс на ўроку спеваў дзеліцца звычайна на тры асноўныя часткі: харавое спяванне, вывучэнне музычнай граматы і нотнай граматы, слуханне музыкі. Калі ў старэйшых класах гэтыя элементы ў асноўным захоўваюцца, дык у пачатковых класах яны парушаюцца. Справа ў тым, што выкладанне ўрокаў спеваў вядзе настаўнік, які не мае спецыяльнай музычнай падрыхтоўкі. Гэта зніжае ўзровень выкладання. Праўда, ў мінулым годзе быў арганізаваны семінар па спевах для настаўнікаў пачатковых класаў горада. Але ён мэты не дасягнуў.

Калі мы сур'ёзна думаем палепшыць эстэтычнае выхаванне вучняў, дык трэба Міністэрству асветы перш за ўсё вырашыць пытанне аб выкладанні ў пачатковых класах. Урокі спявання павінны весці толькі спецыялісты, педагогі, якія маюць музычную адукацыю.

Другое пытанне, якое трэба вырашыць, — гэта арганізацыя больш шырокай сеткі музычных школ і студый. Нельга лічыць нармальным, што не ўсіх дзяцей, якія жадаюць вывучаць музыку, прымаюць у музычныя школы, таму што набор у іх абмежаваны. У Гродна ёсць толькі адна такая школа. Ці можа яна ахапіць усіх жадаючых навучацца музыцы? Вядома, не.

Міністэрства асветы дазволіла школам арганізаваць платныя музычныя гурткі. Але бацькі не выказваюць вялікага жадання пускаць дзяцей у гэтыя гурткі, таму што школа мае толькі адно фартэпіяна. У мэтах падняцця якасці ўрокаў трэба забяспечыць школы магнітафонамі і электрапатэфонамі, каб вучні маглі слухаць музыку ў выкананні майстроў мастацтва.

На якасці выкладання спеваў у школах адбіваецца адсутнасць падручніка спеваў. Міністэрству асветы варта неадкладна вырашыць і гэтае пытанне. Важнае месца займае пазакласная і пазашкольная работа па эстэтычнаму выхаванню. Мы выкарыстоўваем усе магчымасці, каб пазнаёміць вучняў з дасягненнямі мастакоў і кампазітараў мінулага і цяперашняга часу, — паказваем рэпрадукцыі, кіначасопісы і кінакарціны, наладжваем праслухоўванне грампласцінак. Але ўсё гэта ні ў якім разе не можа замяніць праглядаў выставак лепшых твораў мінулага і сучаснага ў галіне музыкі і мастацтва. Нажаль, нават вучні абласных цэнтраў пазбаўлены такой магчымасці. Нам здаецца, што Міністэрству культуры сумесна з Міністэрствам асветы варта было б прадумаць пытанне аб арганізацыі перасоўных выставак фонду Рэспубліканскага мастацкага музея, лекцый-канцэртаў. Многае могуць зрабіць у прапагандзе музыкі музычныя школы і музычныя педвучылішчы. Нажаль, у гэтым пытанні няма выразнай лініі, перспектыўнага плана.

Значна лепш павінна быць арганізавана школьная самадзейнасць.

Я. ЗЛОТНІК.
дырэктар Гродзенскай сярэдняй школы № 6.

У Белдзяржвыдавецтве выходзіць кніга польскіх народных казак «Цудоўныя зярняты», малюнкі да якой зрабіў мастак І. Някрасаў.

На здымку: вокладка і ілюстрацыі да кнігі.

Крыўды падпісчыка

У кнігарню ў горадзе Крычаве зайшоў пажылы чалавек у светлашэрым капелюшы — настаўнік адной з сельскіх школ. Па добраму звычаю нашых сельскіх настаўнікаў, якія вучаць гэтаму і дзяцей, ён прывітаўся з усімі, хто быў у кнігарні, знаёмымі і незнаёмымі, і адразу кінуў позірк на паліцы. Па гэтаму позірку, нецярпліваму і гарачаму, у чалавеку беспамылкова можна было пазнаць заўзятага кнігалюба. Вочы настаўніка спыніліся на кніжцы ў бязавай вокладцы з залатым на карэньчыку цісненнем.

— Здаецца, другая кніга «Сокаў цаліны»? Будзьце ласкавы, падайце, — звярнуўся ён да прадаўшчыцы.

Загадчык кнігарні мяккім рухам адхіліў прадаўшчыцу, якая пацягнулася да кніжкі, сам зняў яе з паліцы і падаў настаўніку. Па ўсім відаць было, што ён адчувае нейкую няёмкасць перад гэтым пакупнікам.

Настаўнік беражліва ўзяў кніжку, правёў рукой па яе ледзярынавай вокладцы і лагодна ўсміхнуўся ўсімі зморшчынкамі свайго твару.

— Добра выдадзена. І папера, і вокладка, усё як мае быць.

Ён расплаціўся, сам акуратна загарнуў кніжку ў газеціну і запытаў.

— А што яшчэ новенькага чакаеце?

Загадчык назваў некалькі кніг і пасля маленькай паузы неяк нерашуча дадаў:

— Зараз праводзім падпіску на збор твораў чэшскага пісьменніка Карэла Чапека.

— Падпіску? Не, годзе, падпісвацца я не буду, — замахаў настаўнік рукамі.

Мы пацікавіліся, чаму чалавек так адмоўна ставіцца да падпісных выданняў.

— Вы самі з'яўляецеся падпісчыкам? — спытаў ён і, не чакаючы адказу, працягваў: — Што б вы сказалі, калі б амаль з кожнага дзевяці выданняў, на якія вы падпісаліся, вам не давалі па аднаму-два тамы. Зірнеш на кніжныя паліцы, а яны ў маім пакоі ўсю сцяну займаюць, і сэрцу балюча робіцца: побач з другім томам стаіць чацвёрты, а за сёмым томам ідзе дзевяты.

— А вы скардзіліся?

— Пра гэта ўжо запытайцеся ў каго належыць, — раздражнёна прамовіў настаўнік і, прыўзняўшы ў знак развітання капялюш, накіраваўся да дзвярэй.

Загадчык кнігарні ў гэты час адчуваў сябе вельмі няёмка.

— Вінаваты, нічога не скажаш, — прамовіў ён, — але паслухайце...

Загадчыкам Крычаўскай кнігарні, якая падпарадкавана Магілёўскаму аблкнігагандлю, тав. Бажкоў працуе ўсяго некалькі месяцаў. Дагэтуль у кнігарні на працягу многіх год працавалі выпадковыя людзі. Іх зусім не цікавілі патрэбы падпісчыкаў. Яны не сачылі за тым, каб з абласной базы кнігагандлю своечасова і ў адпаведнасці з колькасцю падпісчыкаў дастаўляліся ў кнігарню чарговыя тамы падпісных выданняў. Вельмі часта, каб «выцягнуць» план, тамы падпісных выданняў прадаваліся ў розніцу. Кіруючыя работнікі аблкнігагандлю, калі і прыязджалі ў Крычаў, то цікавіліся толькі агульнымі лічбамі выканання плана. Аб задавальненні падпісчыкаў яны звычайна і гаворкі не заводзілі.

Прыняўшы кнігарню, тав. Бажкоў перш за ўсё сутыкнуўся са шматлікімі скаргамі падпісчыкаў. Рэдакцыя раённай газеты здала падпіску на трохтомны энцыклапедычны слоўнік, а атрымала толькі трэці том. Аграном тав. Бацаненка з'яўляецца падпісчыкам на збор твораў Купрына. Ён ніяк не мог набыць у магазіне першых трох тамоў. Батвінаўская сельская бібліятэка не атрымала дзесяткі тамоў Вялікай Савецкай Энцыклапедыі. У магазін зусім не трапілі 12 том збору твораў Чэхава, 15 том Гюго, 5 том Шолахава, 2 том М. Астроўскага, 2 том Гайдара, хоць выйшлі гэтыя тамы ў свет больш года назад.

Тав. Бажкоў улічыў усе прэтэнзіі падпісчыкаў і напісаў пра гэта у аблкнігагандаль.

— Усё зробім, — паабяцаў дырэктар аблкнігагандлю тав. Анціпенка, трэба ж дапамагчы новаму загадчыку кнігарні.

І сваім размашыстым почыркам напісаў: «Таваразнаўцу тав. Ішчанка. Разабрацца». Таваразнаўца перадала гэтую паперку загадчыцы Магілёўскага магазіна падпісных выданняў Курачовай.

— Паглядзі, што там на базе і ў магазіне ёсць, а чаго няма.

А Курачова паклала паперку ў папку і праз мінуту забылася пра яе.

Тав. Бажкоў шле новае патрабаванне. Яно, прайшоўшы ўсё той жа бюракратычны шлях, зноў трапляе ў папку Курачовай.

Не толькі ў Крычаўскім, але і ў многіх іншых раёнах Магілёўскай вобласці можна пачуць ад падпісчыкаў скаргі, што яны не атрымліваюць усіх тамоў падпісных выданняў. Між тым на базе аблкнігагандлю, у магазіне падпісных выданняў у Магілёве і раённых кнігарнях у выніку бяспланавага завозу літаратуры сабралася нямала разрозненых тамоў розных падпісных выданняў. Тое, чаго не хапае ў Быхаве і Клімавічах, можна знайсці ў Асіповічах, Бялынічах і наадварот. Калі высветліць і перакінуць куды трэба гэтыя лішкі, можна задаволіць вельмі многіх пакрыўджаных падпісчыкаў. Але кіраўнікі аблкнігагандлю гэтым не займаюцца. Іх не турбуе і тое, што ў выніку няўважлівых адносін да скарг падпісчыкаў, колькасць апошніх у некаторых раёнах не толькі не павялічваецца, як гэтага трэба чакаць у сувязі з ростам матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця працоўных, а нават змяншаецца.

П. БАРАВІКОЎ.

Сіла братэрства

Гэта здарылася ў час вядомага наступлення савецкіх войск у Заходняй Польшчы ў пачатку 1945 г. Белачырвоныя сцягі рэялі ўжо над большасцю гарадоў і вёсак Польскай рэспублікі. Шматлікія натоўпы сустракалі нас воклічамі: «Нех жые Армія Радзецка!» А танкі ішлі ўсё далей на захад, да граніц трэцяга рэйха, нягледзячы на нямецкія гарнізоны і часці, якія заставаліся ў тыле. Гэтыя недабітыя групіроўкі праціўніка, адпаўзаючы на захад, спальвалі вёскі, забівалі мірных жыхароў...

Да першай палавіны лютага наша часць заняла Вілятава, Магільна, Стральцы... Мы рыхтаваліся раніцай працягваць наступленне на захад, але абстаноўка нечакана змянілася. Праціўнік скацэнтраваў буйную групіроўку танкаў і пяхоты на поўнач ад Пазнані. На досвітку выступілі з задачай заняць горад Маргонін і, перакрыўшы дарогі, не прапусціць праціўніка ў паўднёва-усходнім напрамку.

Да поўдня часць заняла Маргонін і, заняўшы кругавую абарону, пачала адбіваць атакі праціўніка. З наступленнем змроку праціўнік прыціх, і ў гэты час да ўсходняй украіны горада падыйшла вялікая калона крытых фургонаў, з якіх чуліся жаночыя і дзіцячыя галасы. Байцы прынялі іх за бежанцаў, якіх тады вельмі многа рухалася па дарогах Польшчы. Абоз павольна ўехаў у горад і дасягнуў цэнтральнай плошчы. Раптам раздаўся жаночы крык: «Немцы ў павозках!» Крычала жанчына-полька... Секануў кулямёт, і яна змоўкла, падаючы мёртвай на дол.

З фургонаў выскаквалі фашысты, ведучы беспарадачны аўтаматны агонь, каб правацца на заходнія ўскраіны горада і далучыцца да сваіх. Але нашы танкі, якія знаходзіліся там, адкрылі па іх агонь. Гэты своеасаблівы дэсант быў часткова знішчаны, часткова захоплены ў палон.

Палонныя паказалі, што іх было больш роты, пераапранутых у цывільную вопратку, а дзеці і жанчыны былі сілком пасаджаны для маскіроўкі. У задачу дэсанта ўваходзіла: ноччу ўзняць паніку ў горадзе, знішчыць камандны састаў і экіпажы танкаў, каб прарваць нашу абарону.

У горадзе быў хутка наведзены парадак. Нягледзячы на позні час, жыхары, як толькі скончылася страляніна, выйшлі на вуліцы. Яны акружалі нашы машыны, дзякавалі за вызваленне — усюды адчувалася радасць. Мы спрабавалі давецца імя польскай патрыёткі, якая ахяраравала жыццём дзеля нашага выратавання, але наступныя падзеі не дазволілі гэтага зрабіць.

...На камандны пункт часці прыбег усхваляваны начальнік пелітаддзела, падпалкоўнік Касмачоў.

— Дзе штабны аўтобус? — было яго першымі словамі.

І сапраўды, у агульнай мітусні мы не заўважылі, што яго няма. Нехта крыкнуў:

— А сцяг?

Вестка аб тым, што прапаў аўтобус і з ім сцяг, хутка абляцела асабовы састаў. Не хацелася верыць, што сцяг трапіў у рукі ворага, што няма больш нашай «Крамянчугскай» брыгады, удастоенай трох урадавых узнагарод.

На пошукі сцяга ва ўсе бакі былі пасланы танкі з аўтаматчыкамі. На месца ўчарашніх баёў накіравалі ўзмоцненую танкавую роту на чале з падпалкоўнікам Касмачовым.

Танкісты даносілі, што вядуць упартыя баі, але пра аўтобус і афіцэраў штаба, якія знаходзіліся там, ніхто нічога не ведаў. Раніцай ад падпалкоўніка Касмачова было атрымана данясенне, што дасягнут пункт, дзе раней стаяў штаб, праціўнік выбіты, але штабны аўтобус не знойдзены...

Напружанне нарастала. Заканчваўся тэрмін, прадастаўлены вышэйшым камандаваннем на пошукі сцяга. І раптам з машыны, дзе стаяла рацыя, выскачыў радыст і кінуўся да танка камандзіра. Ён з радасным захапленнем паўтараў:

— Сцяг!.. Сцяг знайшлі!..

Цяжка апісаць радасць, якая ахапіла салдат і афіцэраў. Значыць, часць будзе жыць! — радаваліся гэтыя загартаваныя ў баях людзі.

Як усё ж здарылася, што сцяг аказаўся ў штабным аўтобусе, які адстаў ад часці?

Калі часць хутка выступіла ў горад Маргонін, то разам з баявымі машынамі пайшла толькі аператыўная група штаба і невялікая калона тылу. Штабныя часці і тылы пад камандаваннем Касмачова павінны былі выступіць пазней. Для прыкрыцця быў пакінут узвод танкаў і аўтаматчыкі. Сцяг знаходзіўся ў спецыяльна выдзеленым танку. Разам з Касмачовым застаўся намеснік начальніка штаба маёр Вярнігара. Пасля выхаду танкаў з вёскі (назвы не зараз не памятаю), туды ўварваліся фашысты на аўтамашынах і бронетранспарцёрах. Касмачоў падвёў танк са сцягам да штабнога аўтобуса, перадаў сцяг Вярнігары і загадаў выехаць з вёскі на чале калоны тылу, даганяючы часць. Танкавы ўзвод стрымліваў немцаў, пакуль усе машыны не выехалі з вёскі. Потым ён паследаваў за імі. Калі Касмачоў прыбыў на камандны пункт часці ў Маргоніне, выявілася, што штабнога аўтобуса ў тылавой калоне не аказалася.

Потым маёр Вярнігара расказваў:

Атрымаўшы загад падпалкоўніка Касмачова, мы не змаглі ўключыцца ў калону або абагнаць яе, таму я вырашыў выехаць з горада па паралельнай дарозе. Але мне гэта не ўдалося. Па дарозе рухаўся ўжо бронетранспарцёр праціўніка. Каб не выявіць сябе, давялося загнаць аўтобус у бліжэйшы двор. Сцягу і штабным дакументам пагражала небяспека трапіць у рукі гітлераўцаў.

Трэба было неадкладна схаваць іх у надзейным месцы і чакаць дапамогі. У канцы вуліцы відаць быў вялікі каменны будынак. Да яго мы і пабеглі. Адна палова яго аказалася занятай саломай, другая — розным сельскагаспадарчым інвентаром. Услед за намі ў будынак увайшоў стары паляк. Ён моўчкі накіраваўся ў куток, запрасіўшы жэстам ісці за ім. З нашай дапамогай стары адкрыў патаемны люк, які закрываў уваход у падвал. Іншага выхаду не было, і мы рызыкнулі схавацца ў ім.

Узяўшы сцяг і дакументы, я з часткай таварышаў спусціўся ўніз, астатнія засталіся зверху абараняць уваход. З дапамогай кішэннага ліхтарыка ўдалося выявіць, што мы знаходзімся ў прасторным каменным памяшканні, заваленым бочкамі і іншым хламам. Узняўшы некалькі пліт з падлогі, мы сталі капаць яму для сцяга і дакументаў на выпадак, калі фашысты нас выявяць. Трывожныя думкі не пакідалі нас: «З якіх меркаванняў паляк паказаў нам сховішча? Што ён будзе рабіць далей? Ці не ў пастцы мы? Ці прыдзе ў час дапамога? А калі спозніцца, дык ці знойдуць тады сцяг?».

Хтосьці цяжка ўздыхнуў:

— У часці перапалох. Нас шукаюць...

У чаканні дапамогі прайшлі суткі. А раніцай наступнага дня зверху падалі сігнал выходзіць.

Выйшаўшы са свайго сховішча, мы былі аслеплены яркім сонцам і выглядам нашых родных «трыццацьчацвёрак». Доўга радавацца не было часу. Вайна клікала наперад.

Калі мы ўжо садзіліся ў машыны, да нас, засопшыся, падбег паляк, у якім мы пазналі нашага выратавальніка. Мы, спяшаючыся, абняліся і пацалаваліся з ім. І на ўсё жыццё запомнілася яго прозвішча: Шацеўскі. Ён дапамог нам выратаваць гонар часці і жыццё афіцэраў і салдат, якія аказаліся тады ў гэтай вёсцы. Мы з жалем успамінаем, што нам не ўдалося даведацца імя адважнай жанчыны, якая загінула, папярэдзіўшы савецкіх воінаў аб чабяспецы.

А. ВАЙНРУБ,
Герой Савецкага Саюза.

Сцяпан ГАЎРУСЕЎ

РОЗДУМ

Даўней па-свойму час лічылі.
І ў памяці дні бераглі,
Як ад хвароб каня лячылі,
Як нагаворы адвялі.

І ў тых трывогах незабытых,
Ад першых да апошніх дзён
Пра ўласны кут, пра свой набытак
Спрадвечны клопат быў відзён.

І шрамы памятных засечак
Смалой жаўцелі на сцяне...
Спалілі многа богу свечак,
А ён — і вокам не міргне.

І мімаволі ўбачыш чорта,
Заблудзіш ля сасны адной,
Калі жыццё тваё прыпёрта
Суседскай вузкаю мяжой.

Але куды перасяліцца,
Жанатых выправіць дзяцей,
Калі з сынамі падзяліцца
Не мог нічым, апроч лапцей.

Калі ж на свеце душна, цесна —
Сівухаю залі бяду.
Калі ж у дзежцы выйшла цеста —
Садзіся зноў за лебяду.

І зашываліся пад стрэхі
Сямействы кожнага двара,
Дзе шалясцелі, быццам вехі,
Лісткі свайго календара.

А наша зберагае памяць
Не ў мімалётным бляску дні,
А час, калі праз пыл і замяць
Будоўлі ўспыхваюць агні.

Не робім дробязных засечак,
Як багацеў, як рос адзін, —
Даюць святло нам сотні рэчак
У гулкім гомане турбін.

Даўно нас сонца палюбіла,
І дружба ў братні круг звяла,
Нас беззямелле не душыла
І ліхаманка не трасла.

Забылі пра былую звягу,
Што ела сем'і з году ў год,
І лепшым сталі ў нас пасагам
Каму — калгас, каму — завод!

Ды вочы зайздрасныя сочаць,
Другі намеціўшы падзел:
Не проста нас зняважыць хочуць,
Яны бяруць нас на прыцэл.

О, позірк злы старога свету,
Уеўся ў спіны нашы ты!
Не раз мы білі нечысць гэту,
Аж толькі ўгору капыты.

І мы ідзём наперад горда
З высокай праўдай на сцягу,
Ідзём сіняю, крокам цвёрдым,
Дык хто ж стаіць там на шляху?

Магутным веснавым разводдзем
Змяцём з дарогі бруд стары,
Бо ў адрыўным календары
Наш кожны год — дзесяцігоддзе.

ПІСЬМЫ Ў РЭДАКЦЫЮ

Рэцэнзіі і нарысу—больш увагі

Я доўгі час з'яўляюся пастаянным чытачом часопіса «Полымя». Ён непасрэдна дапамагае ў маёй настаўніцкай рабоце. Асабліва мяне цікавіць раздзел часопіса «Публіцыстыка і крытыка». У гэтым раздзеле быў змешчаны цэлы шэраг грунтоўна распрацаваных крытычных артыкулаў. Пры сучасным стане падручнікаў па беларускай літаратуры для вучняў 8—10 класаў гэтыя артыкулы з'яўляюцца каштоўным дапаможнікам для настаўнікаў-мовазнаўцаў.

На вялікі жаль, значна слабей выглядае бібліяграфічны раздзел часопіса. Мне асабіста здаецца, што ў некаторых рэцэнзіях адчуваецца літаратурны штамп; што некаторыя рэцэнзенты, захапляючыся арыгінальнасцю тэмы, мала звяртаюць увагі на тое, якімі мастацкімі сродкамі гэтая тэма вырашаецца, пазбягаюць глыбокага аналізу аўтарскай мовы і мовы герояў твора.

Хочацца кінуць рэдакцыі папрок за занядбанасць такога даходлівага і аператыўнага жанра літаратуры, як нарыс. За ўвесь 1957 год і за 5 месяцаў 1958 года на старонках часопіса надрукаваны толькі тры нарысы і ні аднаго нарыса на тэму калгаснага жыцця. І гэта ў той час, калі калгасная вёска, дзякуючы няспынным клопатам Камуністычнай партыі і ўрада, ідзе да новага, небывалага росквіту!

А. ПАСЬ,
настаўнік Шчэдрынскай сярэдняй школы, Парыцкага раёна.

Не забываць пра малых

Некалькі дзён назад, калі я забіраў свайго сына Юру з ясляў, ён звярнуўся да мяне з вельмі нечаканым пытаннем:

— Тата, а ў нас ёсць пласцінка «Только у любимой могут быть такие необыкновенные глаза»?

На пытанне, дзе ён чуў гэтую песню, Юра адказаў, што такую песню спяваў Грыша (таксама трохгадовы хлопчык).

Узнікае зусім законнае і наспеўшае пытанне: чаму наша прамысловасць не выпускае грампласцінкі дзіцячага рэпертуару? Ва ўсякім выпадку ў Віцебску мне не ўдалося знайсці іх амаль на працягу пяці месяцаў.

А хіба бацькі адмовіліся б набыць пласцінкі са звычайным або даўгаграючым запісам многіх твораў для дзяцей? Няўжо песні для дзяцей дашкольнага ўзросту павінны развучвацца толькі выхавацелямі па памяці са скажэннямі і без акампанемента? Калі б на грампласцінкі запісаць хоць бы палавіну таго, што напісана для дашкольнікаў кампазітарамі і дзіцячымі пісьменнікамі, то было б дасягнута многае.

Мне даводзілася назіраць у яслях, што заняткі з патэфонам у дзяцей праходзяць выключна арганізавана. Яны ўсе сабраныя, уважліва слухаюць музыку і ўсё пачутае лёгка ўспрыймаюць.

Помніцца, некалькі год назад у Мінску былі ў продажы грампласцінкі вытворчасці аднаго з райпрамкамбінатаў горада. У магазінах іх хутка разбіралі. Значыць, і ва ўмовах нашай рэспублікі многае можна зрабіць і для малых.

Ці залежыць гэта ад Міністэрства асветы, Міністэрства культуры ці Беларускага саўнаргаса, няхай яны самі ў гэтым разбяруцца.

Мы ж, бацькі, чакаем не толькі новых запісаў канцэртаў многіх вядомых спевакоў, але вельмі жадаем пачуць пяшчотныя дзіцячыя галасы, дзіцячыя вершы, казкі, песні!

П. ДУБРОЎ,
жыхар горада Віцебска.

Частымі наведвальнікамі літаратурнага музея Я. Купалы з'яўляюцца не толькі жыхары сталіцы, працоўныя нашай рэспублікі, але і іншых братніх рэспублік. Тут знаёмяцца з творчасцю вялікага песняра беларускага народа і дэлегацыі замежных краін.

На здымку: наведвальнікі музея **М. Федаровіч** — дырэктар Суражскага раённага Дома піянераў і **Г. Міхееў**—загадчык навучальнай часткі Быценскага дзіцячага дома ў адной з залаў музея.

Фота **Ул. Крука.**

Лепшы распаўсюджвальнік друку

Закончаны дзесяты клас Луненскай сярэдняй школы Скідзельскага раёна. На руках у Раі Касіла атэстат сталасці. Параўшыся з бацькамі, дзяўчына застаецца ў родным калгасе імя Куйбышава. У той час на ўвесь калгас было выпісана не больш 100 экземпляраў розных газет і часопісаў. Ды і тыя дастаўляліся з перабоямі. У гэтым Рая пераканалася на сваім вопыце. Газету «Чырвоная змена» яна атрымлівала на трэці або чацвёрты дзень.

І вось Рая Касіла стала працаваць калгасным паштальёнам. За плячыма ў яе вялікая паштовая сумка, набітая газетамі, часопісамі і пісьмамі.

Не прайшло яшчэ і года, але і за гэты кароткі тэрмін у калгасе многае змянілася. Усё новыя і новыя калгаснікі падпісваюцца на газеты і часопісы. Цяжэйшай стала сумка, дабавілася работы, але Раіса толькі радуецца гэтаму.

Сваёй добрасумленнай працай Раіса Касіла заваявала любоў і павагу ўсіх хлебаробаў арцелі. Яна дамаглася таго, што кожны калгасны двор атрымлівае газету або часопіс. У калгасе ў 256 дварах распаўсюджвалася 274 перыядычных выданні.

Луненскае паштовае аддзяленне з'яўляецца перадавым у Скідзельскім раёне па распаўсюджванню друку. А Раіса Касіла лічыцца адным з лепшых калгасных паштальёнаў.

— Наш жаданы госць, — так гаворыць пра яе калгаснікі.

І. КРЫШАЛОВІЧ,
райарганізатар «Саюздруку» Скідзельскага раёна.

Кнігі беларускіх пісьменнікаў на ўкраінскай мове

За апошнія гады ў выдавецтвах Украіны былі выдадзены кнігі беларускіх пісьменнікаў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Кандрата Крапівы, Петруся Броўкі, Аркадзя Куляшова, Піліпа Пестрака, Янкі Брыля, Івана Шамякіна.

Гэтымі днямі ў Дзіцячым выдавецтве Украіны выйшла з друку аповесць Якуба Коласа «Дзед Талаш». Кнігу ілюстраваў беларускі мастак А. Волкаў. У гэтым жа выдавецтве хутка выйдзе паэма Міхася Калачынскага «На лясным паўстанку», пераклад арабіў Багдан Чалы. Мастацкае афармленне А. Дзяўяніна.

Выдавецтва «Моладзь» выдае сёлета раман Янкі Маўра «Амок».

У Дзяржлітвыдавецтве Украіны цяпер друкуюцца раман Якуба Коласа «На ростанях», зборнік апавяданняў Змітрака Бядулі «Панас на небе».

У гэтым жа годзе тут выйдзе кніга выбраных вершаў Максіма Танка (пад рэдакцыяй Міколы Нагнібяды, з прадмоваю Міколы Бажана).

Цяпер вялікая група ўкраінскіх паэтаў завяршае работу над перакладамі кнігі выбраных вершаў Пімена Панчанкі і зборніка Анатоля Вялюгіна «Бацька Дняпро».

Шмат перакладаў для зборнікаў М. Танка, П. Панчанкі, А. Вялюгіна зрабілі вядомыя ўкраінскія паэты П. Тычына, М. Рыльскі, В. Сасюра, М. Бажан, А. Малышка, М. Нагнібяда, П. Варанько, Т. Масенка і іншыя.

(Наш. кар.).

Свабодныя грамадзяне

За творчасцю Казімежа Брандыса наш чытач сочыць ужо даўно. Добра вядомы цыкл аповесцей пісьменніка «Паміж войнамі», які заснаваны на здарэннях і праблемах галоў вялікага выпрабавання для польскага народа: нарастанне фашызма перад вайной, перыяд акупацыі і першыя гады пасля вызвалення. Гэтыя творы знайшлі добры водгук у савецкіх чытачоў і звярнулі іх увагу на творчы метад аўтара. За цыкл аповесцей «Паміж войнамі» Казімеж Брандыс быў адзначаны ў 1950 годзе высокай узнагародай польскага урада.

Дзесяткі перадавых польскіх пісьменнікаў старэйшага і малодшага пакалення стварылі рад каштоўных і неабходных для народа твораў. Раман «Грамадзяне» з'яўляецца значным дасягненнем польскай літаратуры. У ім расказваецца аб жыцці Варшавы перыяду 1951—52 гадоў. Падзеі адбываюцца ў розных грамадскіх асяроддзях, а героямі з'яўляюцца грамадзяне Народнай Польшчы: будаўнікі, муляры, металургі, настаўнікі, журналісты, вучнёўская моладзь.

...Мы добра памятаем верасень 1939 года. Тады савецкі народ падаў руку брацкай дапамогі беларусам і ўкраінцам, якім пагражала небяспека нямецка-фашысцкай акупацыі. У Вільні, у Беластоку, у Львове мы сустракаліся з палякамі, якія з радасцю працягвалі нам свае рукі і заяўлялі: «Польшча будзе». Але ў гэты лозунг кожны паляк укладваў свае ўласныя пачуцці. Пілсудчык марыў аб дыктатуры, якая б апіралася на польскі шавінізм і на праграму правага крыла ППС. Прыхільнікі шавіністкай партыі «Озон» («Лагер народнага аб'яднання») схіляліся перад расавым цемрашальствам гітлераўцаў і прытрымліваліся думкі аб тым, што Польшча з'яўляецца «бастыёнам культуры і цывілізацыі на ўсходзе Еўропы». У перакладзе на мову дыпламатыі гэта азначала, што Польшча адыгрывала б ролю т. зв. «санітарнага кардона» паміж светам сацыялізма і капіталізма. А тыя, хто стаяў на пазіцыях сялянскай партыі «Стронніцтво людове», уяўлялі сабе будучую Польшчу маналітнай дзяржавай, у якой не існуе супярэчнасцей паміж памешчыкамі і кулакамі, з аднаго боку, і беднай часткай сялянства—з другога. Пад лозунгам «Польшча будзе» ўсе буржуазныя партыі разумелі Польшчу «ад мора да мора», Польшчу з генацыдам і з сацыяльнай нероўнасцю.

Бандыцкі напад нямецкіх фашыстаў у верасні 1939 года вымусіў многіх палякаў зрабіць «пераацэнку вартасцей». Народ, які зрабіў такі багаты ўклад у скарбніцу еўрапейскай і сусветнай культуры, не мог схіліцца перад захопнікам, а гераічная барацьба савецкага народа на ўсходзе акрыляла надзеяй кожнага сумленнага польскага патрыёта.

Аднак і пасля вызвалення Савецкай Арміяй умовы ў Польшчы яшчэ заставаліся надта цяжкімі. Сляды акупацыі, дыферэнцыяванасць грамадства, эканамічная няўстойлівасць, рэшткі буржуазнай ідэалогіі ў свядомасці некаторых людзей і бесперапынны націск з боку капіталістычных дзяржаў — усё гэта стварыла спрыяльную атмасферу для ўсіх тых, каму не падабалася народная ўлада ў новай Польшчы.

Усё гэта і знайшло адлюстраванне ў рамане Казімежа Брандыса «Грамадзяне», які днямі выйшаў у свет у перакладзе на беларускую мову ў Дзяржаўным выдавецтве БССР. Такія прыхільнікі капіталістычных парадкаў, як персанажы рамана Дзялынец, Гібневіч, Пастыла, Лэнкат, разгромленыя, але недабітыя, яшчэ рабілі сваю брудную справу—на кожным кроку шкодзілі будаўніцтву сацыялізма. Іх метады былі разнастайныя, яны надявалі на сябе любую маску, каб толькі схаваць пад ёй сваё сапраўднае аблічча. І часта ім на вудачку трапляліся сумленныя, але даверлівыя людзі, накшталт Паўла Чыжа і Маравецкага. Першы не змог адразу распазнаць варожае нутро Лэнката, другі — здраднічкай душы Дзялынца.

Павел — сын рабочага, журналіст, які аддаў сваё жыццё рэвалюцыі. Ён прыехаў у Варшаву з найлепшымі намерамі, у ідэальнасць якіх цвёрда верыў. І ўсё ж ён трапляе ў «мяккія лапы» Лэнката. І толькі потым ён зразумеў, што праўда жыцця не ў крыклівых загалоўках яго нарысаў. І калі б ён не перамяніўся, не ўсвядоміў сваёй памылкі, то лёгка ператварыўся б у сафіста рэвалюцыі, а не ў сапраўднага рэвалюцыянера. Яго дыялектыка была б дыялектыкай метафізіка, за плячыма якога хаваецца вораг. А вораг не абавязкова павінен паказваць зубы ці выходзіць з лесу з амерыканскім аўтаматам.

Як жа гэта здарылася, што Павел Чыж, энтузіяст, які ненавідзеў усё зло на зямлі, аказаўся пад уплывам Лэнката, «спазнаў грозную і цяжка даступную розуму сілу хлусні, адчуў яе на сваім гарбу»? Гэта не віна Паўла, а тых абставін, у якіх ён апынуўся. Малады чалавек з добрымі намерамі і амаль без ніякага жыццёвага вопыту, ён не мог адразу распазнаць хітрых ходаў свайго начальніка. Лэнкат умеў карыстацца не толькі сваім службовым становішчам, але і даверлівасцю акружаючых яго людзей. Ён умеў надзець на сябе такую непранікальную маску, што самы спрактыкаваны псіхолаг не мог бы заглянуць у яго душу. Ён не перакульваў праўды дагары нагамі, не хлусіў адкрыта. Яго хлусня заключалася ў тым, што ён умеў карыстацца чужымі думкамі. Выкарыстоўваючы думкі чалавека, ён з іх дапамогаю залазіў да яго ў душу, каб адтуль, з сярэдзіны, кіраваць ім. І ўсё гэта ён рабіў са сваёй асцярожнай, спакойнай развагай. Лэнкат гаварыў словамі Паўла. «Ён карыстаўся партыйнай мовай так спрытна, як злодзей украдзеным ключом. Так, ён украў у Паўла Чыжа ключ і потым пры кожным выпадку лёгка адмыкаў гэтым ключом яго душу».

Павел доўга не мог прызнаць сваёй памылкі, бо не мог уявіць сабе таго, што ён папаўся ў хітра сатканую павуціну. На правільную дарогу яго выводзіць паездка на завод, дзе ён пачуў ад рабочых тое, чаго не мог чуць у сценах рэдакцыі. Смелыя словы рабочага Бальцажа адкрываюць яму вочы на рэчаіснасць. Там, на заводзе, ён зразумеў, якая велізарная сіла заключаецца ў адным партыйным учынку і ў адным чалавеку, які застаўся верны свайму класу.

Пераадолеўшы свае памылкі, Павел Чыж зноў становіцца ў баявы строй. І больш ён ніколі не пахіснецца. Аб гэтым сведчаць яго разважанні ў час першамайскай дэманстрацыі. Гледзячы на стройныя калоны дэманстрантаў, ён думае: «Гэта людзі, з якімі ты будзеш ісці да канца. Твой народ. Ты будзеш дзяліць з ім і радасць і гора, ты назаўсёды з ім звязан і заўсёды павінен адказваць перад ім...»

У сваім рамане аўтар дае некалькі вобразаў ворагаў народнай Польшчы. Зрываючы з іх маскі, ён гэтым самым дапамагае пазнаваць іх метады, выкрываць іх. Людзі, падобныя Лэнкату, Дзялынцу і Гібневічу, баяцца рэвалюцыі, баяцца адказнасці за свае ўчынкі і пакідаюць шкодзіць па меры таго, як іх страх пераходзіць у нянавісць. Часам гэтыя ворагі прыкрываюцца партыйнымі білетамі і крыклівымі фразамі аб рэвалюцыі і сацыялізме. Такі, напрыклад, Пастыла — чалавек, які ненавідзіць жыццё. Ён закраўся паміж вольнымі польскімі грамадзянамі са сваёй злосцю, схаваўшы яе ў цытатах. Статут партыі для яго — гэта зачэпка для расправы над людзьмі. Сярод такіх людзей звычайна вярбуюць сваю агентуру замежныя разведкі і знаходзяць прыхільнікаў рэвізіяністы розных адценняў.

Але грамадзяне новай Польшчы даюць моцны адпор усім тым, хто спрабуе падарваць асновы сацыялізма, прывесці да рэстаўрацыі капіталізма. У гэтых адносінах асабліва цікавым з'яўляецца вобраз Маравецкага, беспартыйнага інтэлігента і сумленнага грамадзяніна. Ён прайшоў надта складаную эвалюцыю ад пасіўнага інтэлігента да актыўнага будаўніка сацыялізма. Будучы даверлівым «тубыльцам у краіне інтэлігенцкіх памылак», ён не разгледзеў у сваім старым таварышу Дзялынцу яго варожасці і злачынных намераў у адносінах да народа. Ён, як верны сын сваёй эпохі, лічыў, што чалавек — недатыкальны, яго трэба апраўдваць, шанаваць і разумець. Таму ён прыходзіць да сакратара партарганізацыі Яраша як пакрыўджаны інтэлігент і «не просіць маральнай кампенсацыі». Але справа Дзялынца канчаткова перавярнула у Маравецкім ранейшыя пазіцыі.

У вобразе Маравецкага раскрываецца галоўная задума рамана «Грамадзяне». Гэты вобраз — заклік да гуманізму, справядлівасці і пашаны чалавечай годнасці. У разважаннях Маравецкага на першамайскай дэманстрацыі — змест усяго рамана: «Асцерагайцеся тых сярод вас, хто хоча дабіваць адстаючых! Ці ж мы не змагаемся за тое, каб усе людзі нараджаліся разумныя, высакародныя і моцныя? Пакуль яны з'явяцца, давайце не будзем пазбаўляць годнасці тых, хто спатыкаецца, але ідзе наперад, не зважаючы часам на страшэнную стомленасць. Гэтыя людзі — частка народа, які ідзе наперад цяжкай дарогай і сам будуе яе... Дазвольце ж кожнаму ўкласці ў гэтую дарогу столькі каменняў, колькі дазваляюць яго сілы, а судзіце толькі тых, хто свядома перашкаджае гэтаму будаўніцтву...» І нарэшце Маравецкі прыходзіць да выводу: «Ясна тое, што мяне яднае з сучаснай рэчаіснасцю ўсё, што я зрабіў у жыцці. Правы грамадзяніна Народнай Польшчы замацаваны за мной тым, што я аддаваў ёй за апошнія гады... У агульнай уласнасці ёсць і мая кропля».

Энтузіязм і творчы ўздым польскага народа ўзняў з руін прыгажуню Варшаву. У рамане «Грамадзяне» ёсць нямала цікавых старонак аб гераічнай эпапеі аднаўлення Варшавы і аб творчым гераізме яе будаўнікоў.

Роля Польскай Аб'еднанай Рабочай Партыі добра паказана як у адбудове Варшавы, так і ў жыцці ўсёй Народнай Польшчы.

Яраш — дырэктар сярэдняй школы і сакратар партыйнай арганізацыі. Крыху суровы, замкнёны і недаверлівы, але справядлівы. Ён доўгі час адпакутваў за сваю ідэю ў турмах, спазнаў там здраду, а таму яго недавер знаходзіць сабе апраўдание. У адносінах да Маравецкага Яраш не спяшаецца рабіць вывады, бо падазрэнне — яшчэ не довад. Дзякуючы яго асцярожнасці і партыйнай прынцыповасці і была прадухілена дыскрэдытацыя сумленнага грамадзяніна.

Міхаіл Кузьнар — просты рабочы, вылучаны на пасаду начальніка будаўнічага трэста. Задушэўны чалавек, добры сем'янін, ён і да людзей адносіцца з глыбокай пашанай. У тэхнічных адносінах ён не стаіць на высокім узроўні. Але ён умее арганізаваць справу, скарыстаць старых спецыялістаў, погляды якіх часам далёкія ад сацыялізма.

Менш выпукла паддзелы ў рамане вобраз сакратара партарганізацыі будоўлі Тобіша, але агульнай задуме рамана гэта не шкодзіць, бо Тобіш заўсёды знаходзіцца на другім плане, ажыццяўляе агульнае кіраўніцтва. На авансцэне ж рамана дзейнічае маса, народ, рухаюць уперад гісторыю грамадзяне Народнай Польшчы.

Маладое пакаленне прадстаўлена ў рамане ў вобразах Антака Кузьнара, яго сястры Бронкі, Агнешкі Небажанкі, Юзі Вейса, Стэфана Свенцкага, Лешака Збаінскага і інш.

У рамане аўтар закрануў і многа іншых праблем — праблему сям'і (Маравецкі, Кузьнар), кахання (Павел — Агнешка), дружбы (Павел—Віктар Зброжак).

Вырашэнне гэтых праблем паказвае, якія маральныя перавтварэнні адбыліся ў польскім грамадстве за гады народнай улады.

Раман «Грамадзяне»— не першая кніжка, якая перакладзена з польскай мовы на беларускую. Але аб сучаснай Польшчы ён дае нашаму чытачу найбольшае ўяўленне.

Некалькі слоў аб перакладзе, над якім старанна працавалі Я. Міско і М. Татур.

Некаторыя памылкова лічаць, што перакладаць з польскай мовы на беларускую лягчэй, чым з іншых моў. Можна смела сказаць, што прыхільнікі такой думкі не ведаюць асаблівасцей польскай мовы, спецыфікі перакладу з яе.

Добрае веданне польскай мовы дазволіла перакладчыкам улавіць усе адценні арыгінала, намёкі, прымаўкі, спасылкі на гістарычныя факты. Усе неалагізмы, якія не паддаюцца перакладу, памечаны зноскамі і змястоўна растлумачаны.

Зусім правільна зрабілі перакладчыкі, не пайшоўшы па лініі «здымання копіі» з арыгінала. Там, дзе трэба, яны знаходзілі эквівалентныя словы, а ў больш цяжкіх выпадках карысталіся аналагамі, адэкватнай заменай ці даступнай мастацкай інтэрпрэтацыяй. Таму пераклад атрымаўся сакавіты і стварае ўражанне, нібы раман быў напісаны не на польскай, а на беларускай мове.

І. СКАПАРАЎ.

ПЕРАДЗ'ЕЗДАЎСКАЯ ТРЫБУНА

За прынцыповасць ацэнак

Вялікі і слаўны шлях, шлях адданага служэння народу прайшла беларуская савецкая літаратура за сорак год. Дзякуючы правільнаму вырашэнню ленінскай нацыянальнай палітыкі, штодзённым клопатам Камуністычнай партыі аб развіцці літаратуры і мастацтва, жыватворнаму ўплыву літаратуры вялікага рускага народа, наша беларуская літаратура заняла адно з вядучых месц у шматнацыянальнай савецкай літаратуры.

Аб тым, што зроблена беларускімі літаратарамі за 40 год Савецкай улады, расказвае нарыс «На шляху служэння народу», напісаны калектывам аўтараў. Ён друкаваўся поўнасцю ў часопісе «Полымя» і выйшаў асобнай кніжкай у Дзяржаўным выдавецтве БССР*).

Аўтары нарыса ставілі сваёй задачай даць кароткі агляд і асвятліць усе важнейшыя падзеі літаратурнага жыцця ад Кастрычніка 1917 года да сённяшніх дзён, даць правільныя ацэнкі тым або іншым літаратурным з'явам, творчасці многіх беларускіх савецкіх пісьменнікаў і паэтаў.

Аўтары нарыса падкрэсліваюць, што ў першыя гады Савецкай улады актывізуецца творчасць лепшых прадстаўнікоў старэйшага пакалення беларускіх пісьменнікаў Я. Купалы, Я. Коласа, Ц. Гартнага, З. Бядулі і іншых. Адным з першых пісьменнікаў, якія прыйшлі ў літературу пасля Кастрычніка, названы паэт М. Чарот, падкрэсліваецца высокі рэвалюцыйны пафас яго творчасці. Гаворыцца аб узнікненні літаратурнага аб'яднання «Маладняк», аб паяўленні першых літаратурных часопісаў. Даецца пералік (праўда, няпоўны) беларускіх пісьменнікаў, якія прыйшлі ў літературу ў 20-я гады, апавядаецца аб далейшым росквіце беларускай літаратуры ў 30-я гады.

У нарысе выразна падкрэслена роля першага Усесаюзнага з'езду савецкіх пісьменнікаў (1934 г.), якую ён адыграў у развіцці ўсёй савецкай шматнацыянальнай літаратуры, творчых ідэй М. Горкага і Ул. Маякоўскага, якія аказалі ўплыў на ўвесь літаратурны працэс.

Але, пры ўсім гэтым, чытаеш першыя раздзелы нарыса і не задавальняешся, аўтары ахапілі ў сваім аглядзе амаль усё, але не далі хоць бы кароткага аналізу асобных твораў, ацэнкі тых літаратурных з'яў, аб якіх наш чытач, асабліва малады, мае вельмі павярхоўнае ўяўленне.

Лепшымі, на нашу думку, з'яўляюцца ў нарысе раздзелы, якія прысвечаны літаратуры часоў Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннаму яе развіццю. Тут выразна акрэслены вытокі бурнага росквіту беларускай літаратуры ў пасляваенны час, адзначана моцная сувязь літаратуры сацыялістычнага рэалізма з жыццём народа, даецца больш поўны агляд, а не проста пералік твораў з маленькімі каментарыямі, які мы бачылі ў папярэдніх раздзелах.

Нарыс не пазбаўлены многіх недахопаў. Галоўны з іх, на нашу думку, у тым, што ён не дае больш-менш поўнага асвятлення важнейшых фактаў і з'яў беларускай савецкай літаратуры 20-х і 30-х гг. Сустракаюцца ў артыкуле недастаткова выразныя і спрэчныя фармуліроўкі і вывады.

Пры пераліку пісьменніцкіх імён аўтары нарыса дзе-ні-дзе заяўляюць, што, маўляў, гэта пісьменнікі, «самыя непадобныя па стылю, па творчай манеры». Але ў чым выяўляецца творчае непадабенства, — аб гэтым не гаворыцца. У гэтым сэнсе цікава прывесці адну заўвагу з пятага раздзела: «Творчы метад нашай літаратуры — метад сацыялістычнага рэалізма — адкрыў неабмежаваныя магчымасці для выяўлення самых розных паэтычных індывідуальнасцей, самых непадобных стылёў. І сапраўды, хіба можна зблытаць яркі метафарычны стыль А. Куляшова з мэтанакіраванай, баявой публіцыстыкай П. Броўкі, своеасаблівы лірыка-іранічны стыль П. Панчанкі з высакапафасным, рамантычным вершам М. Танка?»

У гэтых словах заўважаецца нейкая, хоць і баязлівая, спроба вызначыць стылёвыя індывідуальнасці некаторых нашых паэтаў. Але зроблена гэта скарагаворкай. І да таго ж з асобнымі палажэннямі, заўвагамі, якія робяцца ў нарысе, згадзіцца нельга. Так, напрыклад, прызнаючы яркую метафарычнасць стылю А. Куляшова, аўтары вольна ці міжвольна адмаўляюць тут такую асаблівасць яго паэзіі, як баявую мэтанакіраванасць. Ды і наогул: ці адной толькі метафарычнасцю вызначаецца паэзія А. Куляшова?

У пачатку артыкула гаворыцца аб размежаванні ў асяроддзі дарэвалюцыйных беларускіх пісьменнікаў, аб іхнім успрыняцці Кастрычніцкай рэвалюцыі. Правільна адзначана, што за рэвалюцыяй пайшлі Я. Купала, Я. Колас і іншыя лепшыя беларускія пісьменнікі, якія пачыналі сваю творчасць да Кастрычніка. Правільна, бясспрэчна, і тое, што рад нацыяналістычных пісьменнікаў, такіх, як напрыклад, браты Луцкевічы, скаціўся ў лагер заклятых ворагаў рэвалюцыі і беларускага народа. А вось да якога лагеру прымкнуў, напрыклад, А. Паўловіч, які распачаў сваю творчасць таксама да рэвалюцыі? Якую пазіцыю ў адносінах да рэвалюцыі заняў Ядвігін Ш., які памёр у 1922 г.? Аб гэтым у артыкуле не гаворыцца нічога.

Вядома, што Я. Купала і Я. Колас яшчэ да Кастрычніка напісалі шмат твораў, якія залатым фондам увайшлі ў скарбніцу беларускай літаратуры, на якія звярнулі ўвагу не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Я. Колас і Я. Купала ўжо да рэвалюцыі з'яўляліся нашымі буйнейшымі пісьменнікамі, якіх калі-небудзь ведала беларуская літаратура, агульнапрызнанымі важакамі яе рэвалюцыйна-дэмакратычнага напрамку. Але ўсім вядомы і той факт, што толькі Кастрычніцкая рэвалюцыя прынесла іх творчасці сапраўдны росквіт. Чаму ж аўтары нарыса не палічылі патрэбным сказаць аб гэтым чытачу?

У першым і другім раздзелах нарыса чамусьці не толькі не дадзена ацэнка творчасці многіх пісьменнікаў, якія актыўна выступалі ў літаратуры ў 20-я гады, але нават не названы іх імёны. Вядома, што пазіцыі раду пісьменнікаў у гэты час былі ідэйна заганнымі. І, на нашу думку, тым больш выразна трэба было вызначыць ідэйную накіраванасць у іх творчасці і ні ў якім разе не замоўчваць, не абыходзіць тыя літаратурныя з'явы, якія сёння павінны атрымаць правільную партыйную ацэнку. Так, на нашу думку, трэба было сказаць аб месцы ў беларускай літаратуры і ідэйна-класавых пазіцыях такога пісьменніка, як М. Гарэцкі, які ў 20-я гады выдаў рад кніжак мастацкай прозы. Чамусьці выпалі з-пад увагі аўтараў нарыса такія творча актыўныя тады празаікі, як Я. Нёманскі, В. Каваль, М. Зарэцкі. Дык чаму ж нельга было даць прынцыповай, партыйнай ацэнкі творчасці названых пісьменнікаў (не гаворачы ўжо аб вялікай колькасці іншых), так патрэбнай у наш час? Няма ў нарысе грунтоўнай ацэнкі і дзейнасці літаратурных арганізацый, якія ў Беларусі існавалі ў 20-я гады. Літаральна некалькі слоў сказана толькі аб «Маладняку» і «Узвышшы». Астатнія арганізацыі нават не названы.

Чакаў чытач і ацэнкі работы літаратурных крытыкаў 20-х і часткова 30-х гадоў, такіх, як прафесар І. Замоцін, прафесар Я. Бранштэйн, З. Жылуновіч, М. Гарэцкі і інш. Сучасны чытач павінен добра ўяўляць сабе іх ідэйна-класавыя пазіцыі. Некаторыя з гэтых крытыкаў выказвалі часам погляды, якія не адпавядалі духу савецкай літаратуры. Але ж творчы метад сацыялістычнага рэалізма выпрацоўваўся ў жорсткай і непрымірымай барацьбе супраць усякіх праяў буржуазнай ідэалогіі, і гэтая барацьба адлюстроўвалася ў нейкай меры і ў літаратурнай крытыцы. Адсутнасць ідэйна-класавай ацэнкі дзейнасці многіх літаратурных крытыкаў, якія актыўна выступалі ў друку ў 20—30 гг., зрабіла нарыс няпоўным у характарыстыцы класавай барацьбы, якая была ў літаратуры на працягу першых дзесяцігоддзяў існавання Савецкай улады.

Крайняй непаўнатой вызначаюцца пералікі пісьменнікаў і твораў 30-х гадоў. Так, з твораў даваеннай драматургіі названы п'есы К. Крапівы, адна драма М. Клімковіча, гераічная драма П. Глебкі «Над Бярозай-ракой» і п'еса К. Чорнага «Ірынка», А дзе ж драматургія Міровіча, Рамановіча, Галубка, Кобеца, Гурскага? А дзе ж той уклад, які ўнеслі ў савецкую драматургію Я. Колас, Э. Самуйлёнак, дзе драма К. Чорнага «Вацькаўшчына»?

Вельмі здзіўляе і той факт, што некаторых пісьменнікаў аўтары нарыса называюць упершыню не ў тых раздзелах, якія б адпавядалі пачатку іх творчасці, а значна пазней, і такім чынам проста скажаюцца асобныя факты літаратурнага працэсу. Так, пісьменнікі Я. Маўр, Р. Мурашка ўпершыню ўпамінаюцца ў раздзеле аб літаратуры 30-х гадоў. Між тым, яны даволі актыўна працавалі і ў 20-я гады. І. Гурскі чамусьці ўпершыню ўпамінаецца толькі ў раздзеле аб літаратуры часоў Айчыннай вайны.

Ёсць у нарысе недакладныя і нават няясныя месцы, якія прыводзяць да блытаніны, нікому непатрэбнай. Так, у адным з невялікіх абзацаў робяцца беглыя заўвагі аб творах М. Чарота, Ц. Гартнага і К. Крапівы, і канчаецца гэты абзац наступнымі словамі: «Але ў творчасці асобных пісьменнікаў у пачатку 20-х гадоў празмерна перабольшваўся разбуральны бок рэвалюцыі. Яны яшчэ не маглі глыбока раскрыць вялікай стваральнай сілы Кастрычніка».

Так і незразумела, да каго з пералічаных вышэй пісьменнікаў адносяцца прыведзеныя словы. Хто з іх «празмерна перабольшваў разбуральны бок рэвалюцыі» — М. Чарот або Ц. Гартны? Незразумела таксама, хто з іх яшчэ не здольны быў «глыбока раскрыць вялікай стваральнай сутнасці Кастрычніка». Непадмацаванае фактамі такое сцвярджэнне не можа быць пераканаўчым, тым больш, што яно адрасавана невядома каму (хоць яно і справядлівае ў адносінах да паўных пісьменнікаў). Такой жа няясной для масавага чытача застаецца і агаворка ў тым месцы, дзе сказана, што ў дзейнасці «Маладняка» заўважаліся «элементы асуджанага партыяй «пралеткульта». Тут бы хоць у некалькіх словах трэба было сказаць, што гэта былі за элементы.

Чакаў чытач значна больш поўнага і мэтанакіраванага агляду рэвалюцыйнай літаратуры Заходняй Беларусі да ўз'яднання яе ў адзінай Савецкай дзяржаве. Нельга сказаць, каб тут не быў названы хоць бы адзін з ліку вядомых пісьменнікаў і паэтаў, якія пачыналі свой творчы шлях па той бок мяжы, што існавала да гістарычнага верасня 1939 г. Але незразумела, чаму аўтары нарыса не знайшлі магчымым хоць бы коратка сказаць аб такім важным факце, што рэвалюцыйная літаратура Заходняй Беларусі развівалася і мужнела ў няспыннай барацьбе супраць контррэвалюцыйнай нацыяналістычнай беларускай літаратуры. Не сказана ў нарысе і аб тым, што ў рэвалюцыйнай літаратуры Заходняй Беларусі амаль не было прозы. На гэта, безумоўна, былі прычыны, і іх трэба было паведаміць чытачу. У артыкуле, напрыклад, не дадзена больш-менш поўная ацэнка творчасці такога самабытнага і таленавітага паэта, як М. Засім. Многія вершы яго, напісаныя ва ўмовах панскай Польшчы, сталі шырока вядомымі і друкаваліся ў перакладзе лепшых паэтаў на рускай мове.

Вельмі дзіўным нам здаецца той факт, што М. Клімковіч упамінаецца толькі ў аглядзе нашай даваеннай літаратуры, як аўтар гістарычнай драмы «Кацярына Жарнасек

ТВОРЧЫЯ ПАРТРЭТЫ

Праўда вобраза

У 1952 г. на абароне дыпломных работ у інстытуце імя І. Я. Рэпіна сярод лепшых была адзначана кампазіцыя «Арышт Т. Г. Шаўчэнкі ў 1859 г.», напісаная выпускніком Пятром Серапіёнавічам Крохалевым. Ужо ў дыпломнай кампазіцыі былі якасці, што атрымалі далейшае развіццё ў карціне «Арганізацыя калгаса».

Работа «Арышт Т. Г. Шаўчэнкі ў 1859 г.» хвалюе глыбінёй перажывання людзей. У ёй ясны сюжэт, пераканальна развіваецца дзеянне ў канкрэтных тыповых абставінах. Удалы цэнтральны вобраз Т. Г. Шаўчэнкі. У яго вачах — гнеў і смутак; гэтыя пачуцці, як у люстры, адбіваюцца ў позірках людзей, што стаяць побач і якіх адштурхоўвае ад паэта-барацьбіта казённая рука жандара. Гледзячы на карціну, верыш, што малады мастак глыбока адчуў задуму кампазіцыі, зжыўся з яе героямі, пранікся іх думкамі.

І, нажаль, няма такога адчування, калі глядзіш на карціну «Будаўніцтва ГЭС «Дружба народаў», напісаную пасля прыезду Крохалева ў Беларусь. Мастак імкнуўся тут прасякнуцца веліччу стваральнай працы савецкага чалавека. Ён паехаў у вёску Дрысвяты Відзаўскага раёна, на мяжу трох рэспублік — Беларусі, Латвіі і Літвы, дзе будавалася ГЭС «Дружба народаў». Было напісана з натуры многа эцюдаў, вывучаўся матэрыял. Але сюжэт карціны — лепшая брыгада беларускіх будаўнікоў атрымлівае пераходны сцяг ад ЦК ЛКСМ Беларусі — не атрымаў вобразнага мастацкага ўвасаблення. Кампазіцыя раз'яднана на групы, дрэнна звязаныя адзіным дзеяннем. Некаторыя персанажы проста пазіруюць, зусім не ўзбагачаючы задумы карціны. Раскрыццю задумы не садзейнічае і аднастайны аранжавы каларыт. Так атрымалася таму, што твор, напісаны за вельмі кароткі тэрмін, мала быў перажыты мастаком. У выніку ён пакідае абыякавымі і гледачоў.

Аднак кампазіцыя «Будаўніцтва ГЭС «Дружба народаў» зусім не вызначае творчую індывідуальнасць Крохалева — удумлівага мастака, які валодае здольнасцю назіраць і пранікаць у свет чалавечых пачуццяў. Яму ўласцівы тэмперамент мастака, які добра валодае кампазіцыяй.

Крохалева асабліва вабяць тэмы сялянскага жыцця. Жывыя людзі, убачаныя ў рэчаіснасці, паказаны ў карціне «Рамонт трактараў у цэху МТС» (1955). Тыповы тут вобраз механіка, які дае новае заданне кавалям па рамонту сельскагаспадарчых машын. Характэрныя твары маладых хлопцаў-кавалёў. Праўда, каларыт гэтай кампазіцыі крышку глухаваты і цяжкі, але мастак тут больш цвёрда становіцца на шлях адлюстравання характараў людзей і іх узаемаадносін.

Ва ўральскай вёсцы Мыльнікава Шадрынскага раёна дзесяцігадовым хлопчыкам Крохалеў быў сведкай хвалюючых падзей, якімі суправаджалася ўстанаўленне савецкага калгаснага ладу. Гэтыя ўражанні, моцныя ў памяці мастака яшчэ з дзіцячых год, адыгралі вялікую ролю ў зараджэнні задумы карціны «Арганізацыя калгаса». Кампазіцыя на гэтую тэму была напісана Крохалевым яшчэ ў 1948 г., калі ён вучыўся на III курсе інстытута. У 1955 г. мастак вярнуўся да тэмы, якая здаўна яго цікавіла, і закончыў карціну «Арганізацыя калгаса» да 40-годдзя Вялікага Кастрычніка. Палатно экспанавалася на юбілейнай мастацкай выстаўцы, прысвечанай 40-годдзю Савецкай улады.

...У перапоўненым маленькім сельскім клубе горача ад спрачак-размоў. З гатоўнасцю і верай запісваецца ў калгас бедната, якая ўтварыла дружную, знітаваную групу вакол стала, за якім адбываецца запіс. Горача заклікае паследаваць яе прыкладу селянін-бядняк у белай кашулі. Вобраз яго — адзін з лепшых у карціне. У глыбокім роздуме серадняк, які не ведае яшчэ, ці адважыцца яму на гэты новы крок. Але, гледзячы на яго добры, просты твар працоўнага чалавека, на гэтыя шчыльна сціснутыя агрубелыя рабочыя рукі, чамусьці верыш, што ён падтрымае высакародны пачын. За спіной яго відаць фігуры, якія з выглядам старонніх назіральнікаў ацэньваюць «сітуацыю».

Нягледзячы на тое, што пачуцці персанажаў складаныя і часам супярэчлівыя, мастак усім кампазіцыйным ладам твора імкнецца падкрэсліць, што праўда пераможа.

Кожны персанаж карціны індывідуальна ахарактарызаваны Крохалевым з дастатковай псіхалагічнай вастрынёй. Не зусім удала ўведзены ў кампазіцыю селянін, які чухае патыліцу. Жэст яго вельмі просталінейны. А сама фігура на пярэднім плане заграмаджае палатно і вельмі затрымлівае позірк гледача. Не на поўную меру выкарыстаны ў карціне магчымасці кантрастаў святла і ценю, што зніжае мастацкую паўнацаннасць твора. І ўсё ж карціна пераконвае, запамінаецца, хвалюе, бо па сутнасці сваёй яна дастаткова эмацыянальная.

Крохалеў цяпер знаходзіцца ў росквіце творчых сіл. Ён мяркуе напісаць карціны аб сельскай моладзі, аб гераічнай працы савецкіх рабочых. У майстэрні жывапісца можна ўбачыць цікавыя эскізы да будучых карцін. Асабліва выдатны «Адпачынак на будаўніцтве» (1957), трапна і пазітычна задуманы мастаком.

Задушэўныя партрэты «Думы», «Цёшча», «Уралец», «Дзяўчынка з кнігай» і іншыя сведчаць, што Крохалеў і ў далейшым здолее паглыблена працаваць над вобразам савецкага чалавека ў тэматычнай карціне.

Да 40-годдзя БССР мастак піша карціну, прысвечаную беларускім партызанам. Шмат добрага ёсць ужо і ў пачатковай стадыі работы.

... Доўгім ланцугом расцягнуўся атрад партызан, які хутка пераходзіць пасля праведзенай баявой аперацыі на новыя пазіцыі. Сціплая зімовая прырода Беларусі акружае яе сыноў, а тонкія маладыя, бярозкі, здаецца, суправаджаюць суровых народных мсціўцаў. У кампазіцыі ёсць сціплы пафас, рамантычная прыўзнятасць, а галоўнае — адчуванне ўсенароднасці магутнага партызанскага руху.

Хочацца пажадаць маладому мастаку, каб ён знайшоў гэтай выдатнай тэме дастойнае жывапісна-пластычнае выяўленне.

Ф. ЛЕЙТМАН.

З АПОШНЯЯ ПОШТЫ

Непатрэбная коска

Добрую справу робіць Упраўленне кінафікацыі і кінапракату Міністэрства культуры БССР, што выдае асобнымі нумарамі праграмкі «На экранах Беларусі». Яны выдаюцца масавым тыражом. Ёсць спецыяльныя людзі, якія адказваюць за выданне гэтых праграмак,—рэдактар, карэктар і г. д. Але здзіўляе адно: як можна безуважліва адносіцца да такой адказнай справы, як рэдагаванне літаратурна-мастацкіх тэкстаў.

Днямі з'явіўся апошні, пяты нумар праграмкі «На экранах Беларусі», рэдактарам якой з'яўляецца Б. І. Бартман. Яму, відаць, шмат давялося папрацаваць над тым, каб перадаць кароткі змест кожнага новага фільма, падрыхтаваць тэкст на двух мовах — на рускай і беларускай. Але як не стараўся тав. Бартман, усё ж трапіла ў бочку мёду і лыжка дзёгцю.

У раздзеле «Хранікальна-дакументальныя фільмы» мы чытаем, што ў бліжэйшы час гледачы ўбачаць на экранах новы фільм аб урачыстым паказе ў Лужніках у гонар саракагоддзя Вялікага Кастрычніка. Як вядома, гэты фільм называецца «Пяю маю бацькаўшчыну» («Пою мое отечество»). Фільм названы радкамі з вядомай паэмы Ул. Маякоўскага «Добра», якія вядомы кожнаму школьніку:

І я,
як вясну чалавецтва,
што народжана
ў працы, ў баю,
пяю
радзіму савецкую,
рэспубліку маю.

Пераклад — творчая справа. Адны паэты перакладалі гэтыя радкі з рускай мовы на беларускую лепш, другія — горш, але ўсе яны ўкладвалі ў іх адзін сэнс, адно высокае пачуццё, з якім пісаў Маякоўскі свае палымяныя вершы.

Рэдактар жа праграмкі «На экранах Беларусі», відаць, не ў ладах з вялікім, паэтам і пераклаў некаторыя з гэтых радкоў па-свойму, без уліку не толькі рытмікі, рыфмы, але нават і знакаў прыпынку. Яму для чагосьці спатрэбілася яшчэ адна коска, акрамя тых, якія паставіў у сваім вершы паэт. І вось знаёмыя радкі Маякоўскага, якімі названы фільм, пасля рэдагавання тав. Бартмана, мы чытаем у такім выглядзе: «Пою, мое отечество», а побач, у другой калонцы: «Спяваю, мая бацькаўшчына». Атрымаўся зусім іншы сэнс, не той, што ўкладзены ў цудоўныя радкі паэта. У кінагледачоў, якія набылі праграмку, гэта выклікала проста здзіўленне.

Трэба сказаць, што няўважлівасць да рэдагавання праграмак назіраецца не толькі ў дадзеным выпадку. Здзіўляе яшчэ і тая неахайнасць, якую дапускаюць рэдактары гэтых праграмак у перакладзе тэкстаў з рускай на беларускую мову. Вось у тым жа, пятым нумары праграмкі «На экранах Беларусі» ў пераказе зместу мастацкага фільма «Лісі» (вытворчасць «Дэфа-фільм», ГДР) мы чытаем: «Мары каштавалі нядорага і былі больш даступныя, чым работа і хлеб», або: «...ён абяцаў Лісі выгнаць яе з працы...»

Праграмкі «На экранах Беларусі» павінны рэдагавацца больш пісьменна!

Семінар загадчыкаў дзіцячых бібліятэк

Днямі Міністэрства культуры БССР і ЦК ЛКСМБ склікалі семінар загадчыкаў дзіцячых бібліятэк і дырэктараў дамоў піянераў рэспублікі. Культасветработнікі абмяняліся вопытам работы, абмеркавалі пытанні прапаганды дзіцячай кнігі.

На семінар былі запрошаны і беларускія пісьменнікі. В. Вітка, Ус. Краўчанка, А. Асіпенка расказалі аб рабоце часопісаў «Вясёлка», «Бярозка», «Маладосць». Ул. Шахавец паведаміў аб новых кнігах, якія будуць выдадзены ў бліжэйшы час рэдакцыяй дзіцячай літаратуры Белдзяржвыдавецтва. Затым Э. Агняцвет, С. Грахоўскі і П. Макаль прачыталі новыя творы, прысвечаныя дзецям.

Канцэрт з твораў выдатнага кампазітара

Грамадскаць Мінска ўрачыста адзначыла 50-годдзе з дня смерці геніяльнага рускага кампазітара, выдатнага педагога і музычнага дзеяча Мікалая Андрэевіча Рымскага-Корсакава. Вечар, прысвечаны гэтай даце, адкрыў намеснік міністра культуры БССР Янка Шарахоўскі. Даклад аб жыцці і творчай дзейнасці кампазітара зрабіў лектар Беларускай дзяржаўнай філармоніі Л. Ауэрбах. З прывітаннем да дзеячоў мастацтва рэспублікі ад імя польскай дэлегацыі, што прымае ўдзел у Днях польскай культуры на Беларусі, выступіў прафесар Антоні Лыжваньскі.

Пасля ўрачыстай часткі быў дадзены вялікі канцэрт з твораў М. А. Рымскага-Корсакава.

Сімфанічны аркестр пад кіраўніцтвам дырыжораў В. Дуброўскага і Данутy Каладзейскай (ПНР) вельмі вяроўна выканаў складаную праграму. З бляскам і віртуознасцю прагучала ў трактоўцы В. Дуброўскага славутае «Іспанскае капрычыё». Вельмі зладжана іграў аркестр цалкам і дасканала выканалі свае партыі саліруючыя скрыпка, флейта, кларнет, арфа, англійскі ражок і валторна. З выразнасцю выканалі сваю партыю і ўдарныя інструменты, медная група; пераканаўчымі былі дынамічныя кантрасты ў другім эпізодзе «Іспанскага капрычыё», імклівасць танцавальнай сцэны ў чацвёртым эпізодзе і г. д. Але побач з гэтым вельмі невыразна прагучаў музычны малюнак для сімфанічнага аркестра «Садко» (дырыжор таксама В. Дуброўскі). Тут аркестр іграў не разам, флейта гучала вельмі высока, пераходы ад меншых гучнасцей да большых і наадварот выконваліся «рыўком», не было пявучасці і лёгкасці ў партыі кантрабасаў ва ўступе да малюнка («Бязмежнае мора»). Зусім не атрымаўся эпізод танца на марскім дне, дзе Садко рэзка абрывае струны на гуслях і ўсё ў аркестры раптам заціхае, каб зноў маляваць супакой бязмежнага мора.

Фальшыва гучалі медная група аркестра ў сімфанічным фрагменце «Тры цуды» з оперы «Казка аб цары Салтане», а драўляныя інструменты і валторны — у акампанеменце арыі Царэўны-лебедзя з гэтай жа оперы. Дарэчы, зусім не ў магчымасцях саліткі філармоніі Т. Лукянавай выкананне гэтай партыі, як і арыі Снягурачкі з аднайменнай оперы. Аркестр заглушаў саліста філармоніі Д. Зубрыча, які вельмі музычна, з добрым тэмпераментам выканаў рэчытатыў і арыю Гразнова з оперы «Царская нявеста» і арыю Мізгіра з оперы «Снягурачка».

І зноў прыемная нечаканасць: з вялікім настроем было выканана аркестрам пад кіраўніцтвам В. Дуброўскага ўвод з оперы «Залаты пеўнік», вельмі ўдала музыканты акампаніравалі цудоўнай спявачцы, сцэнічна вельмі прывабнай салістцы філармоніі Л. Шубінай, якая па-майстэрску праспявала арыю Любашы з оперы «Царская нявеста» і 3-ю песню Леля са «Снягурачкі».

Парадаваў аркестр і ў акампанеменце салісту Вялікага тэатра Саюза ССР А. Сярову. Тут трэба адзначыць выдатную іграў першай валторны (артыст Э. Фарбераў) у рэчытатыве і арыі Леўкі з оперы «Майская ноч», што музычна выканаў спявак. Менш задаволіў А. Сяроў у арыі Берандзея з оперы «Снягурачка» і ў «Песні індыйскага госця» з оперы «Садко», таму што яго голасу не хапае патрэбнай мяккасці, ён гучыць вельмі па-бытавому.

Пад кіраўніцтвам Данутy Каладзейскай аркестр філармоніі іграў тры часткі з сімфанічнай сюіты «Шэхеразада». Дырыжор добра адчувае форму гэтага твора. Усе яго маляўнічыя тэмы-вобразы ўспрымаліся не як яркія прыватнасці, але як вельмі адказныя дэталі хвалюючай аповесці аб грозным Шахрыяры і яго пяшчотнай жонцы Шэхеразадзе, чые лейттэмы ў багатым развіцці праходзяць праз увесь твор. Лепей, чым першая і другая часткі сюіты, прагучала чацвёртая, нягледзячы на тое, што яна найбольш складаная па сваёй пабудове, па колькасці праходзячых у ёй тэмвобразаў. Асабліва ўдала дырыжор і аркестр правялі фрагмент «Свята ў Багдадзе», дзе патрэбны дакладны рытм у імклівай мелодыі. У першых двух частках фальшыва іграли драўляныя інструменты, не было ўпэўненага гучання меднай групы. Выдатна правёў сваю партыю саліст аркестра — скрыпач С. Асновіч.

І. ІНІЧ.

МІНСКІ ВАЛЬС

Музыка М. ШУМІЛІНА
Словы А. БАЧЫЛЫ



1. Ранішняе сонца ў вокнах залаціцца
Зіхаціць у парках чыстая раса.
Ты ўстаеш на працу, родная сталіца,
Беларусі гонар, нашая краса.

2. Помнім дні былыя... Мінск умеў
змагацца,
Мінск умеў свабоду ў бітвах адстаяць.
Дзе былі руіны — сёння там палацы,
Сёння там заводы, новыя стаяць.

3. На праспекце светлым, вуліцах
шумлівых,
У прасторных клубах, школах і садах.
Твой народ вясёлы, твой народ шчаслівы,
А ў блакітнай выс —твой чырвоны сцяг.

4. Мілы сэрцу горад, не абняць вачыма...
Можам пахваліцца, паказаць гасцям.
Слава добрым справам, партыі любімай,
Слава і, мінчане дарагія, вам!

Рукапісныя спісы паэмы „Тарас на Парнасе"

Парадыйна-сатырычная паэма «Тарас на Парнасе» — адзін з тых мастацкіх твораў мінулага стагоддзя, якія паклалі пачатак развіццю крытычнага рэалізма ў беларускай літаратуры. Упершыню, як вядома, яна апублікавана ў 1889 г. у «Минском листке», а праз год—у газеце «Смоленский вестник», якая, дарэчы сказаць, праяўляла цікавасць да твораў беларускай літаратуры і апублікавала ў 1890 г. другую беларускую парадыйна-сатырычную паэму — «Энеіда навыварат».

У наступныя гады паэма «Тарас на Парнасе» публікавалася ў розных газетах і выходзіла асобнымі выданнямі. Толькі ў Віцебску паэма за 1896 г. друкавалася 5 разоў. З 1896 г. па 1904 г. тут выйшла шэсць асобных яе выданняў. Неаднаразова паэма друкавалася ў Гродна, Магілёве, Вільні і іншых гарадах. Вядома каля 20 друкаваных варыянтаў паэмы, апублікаваных да 1917 г., якія ўяўляюць вялікую цікавасць для даследчыка беларускай літаратуры XIX стагоддзя.

Значную цікавасць уяўляюць таксама і некаторыя рукапісныя спісы паэмы, якія дайшлі да нас.

Два спісы знойдзены ў архівах і ніколі не публікаваліся. Адзін з іх знаходзіцца ў паперах П. В. Шэйна [1]), які многа год збіраў і вывучаў творы вусна-паэтычнай творчасці беларускага народа. Другі спіс захоўваецца ў аддзеле рукапісаў Цэнтральнай бібліятэкі Акадэміі навук Літоўскай ССР у Вільнюсе [2]). У адрозненне ад спіса Шэйна ён пісаны лацінкай і не мае канца.

Яшчэ два спісы паэмы знаходзяцца ў аддзеле рэдкіх кніг Дзяржаўнай бібліятэкі імя Ул. І. Леніна ў Мінску [3]). Яны апублікаваны ў брашуры М. Доўнар-Запольскага «В. Дунін-Марцінкевіч і яго паэма «Тарас на Парнасе» (Віцебск, 1896) і асобна «Тарас на Парнасе. Беларуская паэма». (Віцебск, 1896). Да аднаго з тэкстаў паэмы прыкладзены артыкул «Спроба пяра», які застаўся ненадрукаваным і аўтара якога ўстанавіць не ўдалося.

Рукапісныя спісы паэмы дазваляюць вырашыць некаторыя пытанні, звязаныя з тэксталогіяй паэмы.

Сюжэтная канва паэмы ў Віленскім спісе і ў спісе Шэйна аднолькавая і ў цалым супадае з сюжэтнай канвой друкаваных выданняў. Але, як і там, ёсць розначытанне. Так, у спісе Шэйна чытаем:

То ён знянацку пацалуе,
То хустку з галавы здзярэ,
То ў гармоніку зайграе,
То німфам песню запяе,
То адным вокам ён міргае.

У Вільнюскім спісе гэтае месца выглядае так:

То знянашку ён пацалуе,
Ажно было стыдна глядзець.
То ў гармоніку зайграе,
Веселя сябе і іх,
То німхвам песні заспявае,
Так і візжыць каля іх.

Аналагічныя варыянты сустракаем і ў іншых спісах паэмы. Прафесар М. Доўнар-Запольскі пісаў, што да яго «Тарас на Парнасе» дайшоў «у скажоным выглядзе з розных канцоў Мінскай і Магілёўскай губерняў» і што многія строфы маюць недакладнасці і пропускі.

Чым тлумачыць гэтыя варыянты? Тым, што паэма дзесяцігоддзямі бытавала ў спісах; вусная перадача паэмы прыводзіла да пропускаў, дапаўнення або змен цэлых строф, вершаў, паасобных слоў. Расказчыкі ўносілі ў тэкст новыя рысы, перадаючы тыя ці іншыя падзеі па-свойму.

Змены ў тэксце тлумачацца і тым, што спісы рабіліся ў розны час, у розных мясцовасцях. У аснове твора ляжалі адны і тыя ж вобразы, матывы і г. д., але ў кожнай сацыяльнай групе насельніцтва некаторыя эпізоды, вершы перарабляліся, адлюстроўваючы ў паўнай меры яе інтарасы і густы. Так, у віцебскім спісе паэмы слова **«войт»** (у радку: «І войт ні разу не збрахаў») заменена другім — «ураднік».

М. Доўнар-Запольскі апублікаваны ім тэкст «Тараса на Парнасе» склаў з многіх спісаў, якія ў яго былі.

Цяжка сказаць, які быў першапачатковы аўтарскі тэкст паэмы. Гэтым цікавіліся даследчыкі яшчэ ў канцы мінулага стагоддзя. Невядомы аўтар артыкула «Спроба пяра» піша, што цікава было б надрукаваць паэму такой, як яна выйшла з-пад пяра аўтара. «Ды толькі нідзе няможна знайсці яго рукапіс», — піша ён. Пошукамі арыгіналу паэмы займаліся Е. Раманаў, А. Сапуноў, В. Стукаліч. Але ім удалося знайсці толькі рукапісныя спісы. Е. Раманаў выдаў «Тараса на Парнасе» ў Магілёве (1902 г.). У прадмове да паэмы ён пісаў: «З прычыны таго, што немагчыма знайсці арыгінальны тэкст», твор публікуецца па спісах, «якія бытавалі ў Віцебскай і Магілёўскай губернях».

Калі параўнаць некаторыя публікаваныя тэксты «Тараса на Парнасе» з рукапіснымі спісамі, то выяўляецца, што ў першых адсутнічае месца, звязанае з імем Ф. Булгарына. Адпаведных строф няма, напрыклад, у варыянце, апублікаваным у «Минском листке». У тэксце, надрукаваным Е. Радзімічам (псеўданім Е. Раманава) у кніжцы «Міласцівы Осіп» (1896 г), замест тых строф пастаўлены кропкі. Магчыма, што радкі паэмы, якія выкрываюць рэдактара і выдаўца газеты «Северная пчела», выкраслены цэнзурай.

У спісе П. Шэйна ёсць вершы, паасобныя словы і выразы, якія адсутнічаюць у друкаваных варыянтах паэмы. Прыклады: «Бо я ж **дырэктарам** усіх газет». «Прычэплен быў каўчан і жбан» і г. д.

Рукою Шэйна на палях зроблены заўвагі з варыянтамі да многіх вершаў паэмы. Відаць, ён меў і іншыя рукапісныя спісы. Гэтыя заўвагі таксама ўяўляюць цікавасць, паколькі не сустракаюцца зусім або сустракаюцца вельмі рэдка ў друкаваных выданнях паэмы такія радкі: «Пан вахмістр яго дужа шанаваў», «Пашоў я пасть міжо-мхоў», «Як бы шкрынку хто паслаў», «Хлапец пекны, круглаліцы», «І жмець, жмець проста на гары» і г. д.

У савецкі час паэма «Тарас на Парнасе» друкавалася многа разоў. Нажаль, у некаторых выданнях узяты ў аснову тэкст, які, нам здаецца, найбольш аддалены ад аўтарскага. Так, у выданні 1939 г. (Мінск, ДВБ) замест імёнаў Лермантава і Жукоўскага фігуруюць імёны Міцкевіча і Каханоўскага.

Імёны апошніх сустракаюцца толькі ў тэксце, апублікаваным М. Доўнар-Запольскім, і ў двух іншых друкаваных тэкстах (Мінск, 1917 г.). Ва ўсіх астатніх друкаваных варыянтах паэмы (а іх некалькі дзесяткаў) указаны імёны Лермантава і Жукоўскага.

У Вільнюскім рукапісным спісе і ў спісе Шэйна побач з імёнамі Пушкіна, Гогаля стаяць імёны Лермантава і Жукоўскага.

У эпізодзе ля Парнасавай гары гутарка ідзе аб рускай літаратуры, аб барацьбе ў ёй двух грамадска-палітычных лагераў — прагрэсіўнага і рэакцыйнага. Значыць, аўтару беларускай паэмы дарэчы было гаварыць пра сучасных яму рускіх пісьменнікаў, а не пра польскіх, ды яшчэ пра такога, як Каханоўскі (творчасць яго адносіцца да сярэдзіны XVI стагоддзя).

У рукапісных спісах паэмы ёсць чатырохрадкоўе, якое, як правіла, адсутнічае ў тэкстах паэмы, апублікаваных за апошнія 30 год. У спісе Шэйна гэтыя вершы чытаюцца так:

Яна ў наймітках узята ў небе,
Што б есць варыць і плаціць мыць.
Нябось на цяжкім жывець хлебе,
Не шутка ж столькіх накарміць.

Гэтае чатырохрадкоўе (з некаторымі зменамі) ёсць у пераважнай большасці дарэвалюцыйных друкаваных варыянтаў паэмы, і ў прыватнасці ў тэкстах, апублікаваных у «Смоленском вестнике» (1889 г.), у «Витебских губернских ведомостях» (1896, 1902, 1904 г. г.), у Гродзенскім і Магілёўскім выданнях паэмы (1898, 1902, 1904 г. г.) і ў многіх іншых. Яно ідзе непасрэдна за радком: «Прынёсшы — бразь, сярод стала» і звязана з вобразам Гебы, у асобе якой паказана маладая батрачка. У плане сацыяльнай характарыстыкі персанажаў, паказу ў паэме беларускага сялянскага побыту часоў прыгонніцтва, прыведзенае вышэй чатырохрадкоўе мае важнае значэнне і павінна быць, на нашу думку, уключана ў тэкст усіх наступных выданняў. Думаецца, вершы гэтыя былі і ў арыгінале паэмы.

Увагу даследчыка прыцягвае і артыкул «Спроба пяра». Ён напісаны на беларускай мове. Аўтарам яго быў, відаць, нехта з аматараў беларускай славеснасці. Ён піша, што «Тарас на Парнасе» вельмі папулярны: «Ужо гадоў больш як сорак беларуская байка гэта стала ўсім вядома ў трох губернях: Магілёўскай, Віцебскай і Мінскай — і старому, як той кажа, і малому, і пану, і простаму, і пісьменнаму, і цёмнаму... Пісьменныя шчыра пішуць яе сабе ў паперу, цёмныя ж шчыра вучаць яе напамяць. А чым яна люба? Невучоныя любяць яе за тое, што яе лёгка можна пазаць, бо напісана яна на роднай іх беларускай мове, ды за тое, што шчырую праўду гаворыць у ёй сачыніцель пра тутэйшае жыццё».

Гэтае сведчанне сучасніка 90-х г. г. мінулага стагоддзя, як і рад іншых фактаў, пераканальна абвяргае памылковую думку некаторых даследчыкаў пазнейшага часу, што «Тарас на Парнасе» нібы быў вядомы толькі ў інтэлігенцкім асяроддзі і што паэма, як аб гэтым пісаў акадэмік Я. Карскі, «не пераходзіла ў просты народ». У сапраўднасці ж яна была вядома і карысталася папулярнасцю ў народзе. Гэта пацвярджае і Е. Раманаў, які ў адной з заўваг, апублікаваных у «Могилевских губернских ведомостях» (№ 15, 1901 г.) пісаў, што з усіх «твораў пераважна сатырычнага і гумарыстычнага зместу найбольшай папулярнасцю ў народзе карыстаецца «Тарас на Парнасе».

Асабліва высока цэніць аўтар артыкула «Спроба пяра» тое месца ў паэме, дзе высмейваецца Булгарын і Грэч, якія, на яго думку, «не напісалі нічога добрага», «і ўздумалі, што яны вялікія пісьменнікі». У параўнанні з Пушкіным, Гогалем, якіх аўтар называе «нашымі найлепшымі сачыніцелямі», «брахун» Булгарын выглядае «пчанюком» Моськай, што ў байцы Крылова брахаў на слана».

У артыкуле каменціруецца рад месц з «Тараса на Парнасе», у прыватнасці, даюцца каментарыі да персанажаў з грэчаскай і рымскай міфалогіі, якія фігуруюць у творы.

Паэму «Тарас на Парнасе» невядомы аўтар артыкула лічыць «спробай пяра» на ніве беларускай мастацкай літаратуры, якую чакае вялікая будучыня. У гэтай сувязі ён з радасцю зазначае, што герой паэмы «праштурхаўся на Парнас», пакінуўшы «пад гарой» рэакцыйных літаратараў.

«Спроба пяра» — адзін з першых літаратуразнаўчых артыкулаў у беларускай літаратуры канца XIX стагоддзя. І ў гэтых адносінах ён ўяўляе для нас вялікую цікавасць.

Даўно наспела неабходнасць выдаць узакладнены навукова пракаменціраваны тэкст паэмы «Тарас на Парнасе», якую М. Багдановіч лічыў выдатнай з'явай у беларускай літаратуры дарэформеннага часу.

І. БАС,
кандыдат філалагічных навук.

[1]) Архіў АН СССР у Ленінградзе, ф. 104, воп. 1., д. № 590.
[2]) ВБФ — 927
[3]) № 091 — 4297

Галоўны рэдактар Мікола ТКАЧОЎ.
Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Аляксандр БУТАКОЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Аркадзь МАРЦІНОВІЧ (адказны сакрэтар), Пятро ПРЫХОДЗЬКА, Раман САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), Янка ШАРАХОЎСКІ, Іван ШАЦІЛА, Рыгор ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у сераду і суботу.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, аддзела літаратуры — 3-22-04, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-21-53, выдавецтва — 3-19-52, бухгалтэрыі — 3-11-03.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА НА ГАЗЕТУ: на месяц — 3 р. 50 к., на квартал — 10 р. 50 к., на паўгода — 21 р., на год — 42 р.

АТ 00905

Друкарня імя Сталіна